Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

16 ЛЮТАГА 2023 г. ЧАЦВЕР № 31 (29911)

ІГАР МАРЗАЛЮК — ПРА СІМВАЛЫ БЕЛАРУСКАЙ ВЕЧНАСЦІ 4

САКРЭТЫ СЯМ'І МІРНЫХ

ЦЫТАТА ДНЯ

Андрэй ІВАНЕЦ, міністр адукацыі:

«Урадам падрыхтаваны праект закона Рэспублікі Беларусь аб дапаўненні Кодэкса аб адукацыі нормай, якая дае магчымасць работнікам школ набываць гарачае харчаванне паводле натуральных норм, устаноўленых для харчавання навучэнцаў. Плата за абед, які для дзяцей датуецца дзяржавай, для настаўнікаў будзе рабіцца з невялікім павышаючым каэфіцыентам. Да прыняцця прававога акта гэтае пытанне ўрэгулявана сумесным пісьмом Мінадукацыі і Міністэрства антыманапольнага рэгулявання і гандлю».

КАРАТКА

- **Беларусь і Расія падпісалі пагадненне аб адзінай прамысловай палітыцы.**
- Экспарт беларускай сельгаспрадукцыі ў 2022 годзе склаў $8,3 млрд.
- **Літва з 16 лютага закрывае чыгуначны пункт пропуску на мяжы з Беларуссю.**
- Пілотны праект па харчаванні школьнікаў плануюць прадоўжыць да канца навучальнага года.
- **Беларусы ў 2022 годзе павялічылі спажыванне электраэнергіі для ацяплення і гарачага водазабеспячэння ў 1,7 раза.**
- Мінбудархітэктуры ўстанавіла каэфіцыент змянення кошту будынкаў і збудаванняў.
- **Полацк вачыма мастака Уладзіміра Шапо можна будзе ўбачыць на выставе ў Мінску.**

ISSN 1990 — 763X

Дзеля памяці

Прыклад бескарыслівага служэння чалавецтву

На Востраве Слёз у Мінску ўшанавалі памяць воінаў-інтэрнацыяналістаў

Фота Вікторыі ІВАНЧЫКАВА.

Гэта ўжо стала традыцыяй: 15 лютага, у гадавіну выводу савецкіх войскаў з Афганістана, каля мемарыяла «Востраў Мужнасці і Смутку» збіраецца вялікая колькасць людзей. Дэлегацыі ад дзяржаўных органаў, грамадскіх арганізацый, сілавога блока, а таксама ўдзельнікі тых падзей, курсанты, студэнты, школьнікі — жадаючых ускласці кветкі каля помніка, а значыць, выказаць даніну павагі тым, хто не вярнуўся з афганскай вайны, і ўчора было надзвычай шмат. Тут сабраліся баявыя таварышы, ужо старыя маці і немаладыя жонкі, дзеці воінаў-інтэрнацыяналістаў, некаторыя з якіх не памятаюць свайго бацьку. Бясконцы людскі паток сведчыў аб тым, што гэтыя падзеі ніколі не будуць сцёртыя з нашай памяці.

Зварот воінам-інтэрнацыяналістам, ветэранам вайны ў Афганістане накіраваў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка. «Сёння, у Дзень памяці воінаў-інтэрнацыяналістаў, мы выказваем глыбокую ўдзячнасць і падзяку ўсім, хто сумленна і мужна выканаў воінскі абавязак за межамі радзімы, — адзначыў кіраўнік дзяржавы. — У складзе абмежаванага кантынгенту савецкіх войскаў у Афганістане нашы суайчыннікі першыя ў свеце кінулі выклік міжнароднаму тэрарызму і назаўжды засталіся верныя ваеннай прысязе».

Як гаворыцца ў звароце, праз дзясяткі гадоў многія беларускія сем'і захоўваюць трывожныя ўспаміны аб той вайне. Беларусь шануе сваіх сыноў, якія загінулі на полі бою, смуткуе разам з іх роднымі і блізкімі. «У цяперашні час мы з'яўляемся сведкамі таго, як салдаты ўдачы і наёмнікі з усяго свету сыходзяцца ў гарачыя пункты ў пошуках нажывы, — звярнуў увагу беларускі лідар. — Воіны-«афганцы» ж сталі прыкладам бескарыслівага служэння чалавецтву, не толькі на доўгія гады прадухіліўшы распаўсюджванне экстрэмізму і наркагандлю, але і стварыўшы ўмовы для дабрабыту насельніцтва на вызваленых тэрыторыях».

СТАР. 3

На слыху

ЭКЗАМЕН ДЛЯ ЎСІХ

Выпускная кампанія ў новым фармаце, у якой паўдзельнічала больш як 52 тысячы адзінаццацікласнікаў, вытрымала першы пробны іспыт. Рэпетыцыйны цэнтралізаваны экзамен прайшоў 28 студзеня ў краіне на высокім арганізацыйным узроўні. Аб гэтым паведаміў на сустрэчы з журналістамі намеснік міністра адукацыі Аляксандр КАДЛУБАЙ.

ДЭТАЛЁВЫ РАЗБОР НЕДАХОПАЎ

— Для разумення маштабнасці праведзенага мерапрыемства прывяду некалькі лічбаў: пад рэпетыцыю ЦЭ было задзейнічана па краіне 144 пункты і 2 592 аўдыторыі: больш за тысячу аўдыторый — на базе ВНУ, 998 — на базе каледжаў і 569 — на базе школ, гімназій і ліцэяў. Да мерапрыемства было прыцягнута каля 8 тысяч педагагічных работнікаў, з іх амаль 6,6 тысячы — з устаноў агульнай сярэдняй адукацыі. Для параўнання: у 2022 годзе падчас цэнтралізаванага тэсціравання адначасова максімальна было задзейнічана 1 262 аўдыторыі. А ўсяго па краіне быў адкрыты 41 пункт здачы ЦТ, — праінфармаваў намеснік міністра.— Сёння, у тым ліку з улікам справаздач, якія паступілі з месцаў, можна канстатаваць, што правядзенне рэпетыцыі цэнтралізаванага экзамену па некалькіх навучальных прадметах у адзін дзень не выклікала сур'ёзных цяжкасцяў. Заўважу, што рэпетыцыю мы праводзілі не для таго, каб паказаць грамадству, што сістэма адукацыі поўнасцю гатовая да новага фармату выпускной кампаніі, а каб паглядзець на тыя праблемы, якія могуць узнікнуць у працэсе яе правядзення.

Што ў правядзенні ЦЭ трэба адпрацаваць і адшліфаваць?

Фота БелТА.

СТАР. 15

І КОЛЬКАСЦЮ, І ЯКАСЦЮ

Прэзідэнт падпісаў Закон «Аб асновах грамадзянскай супольнасці» і папраўкі ў законы аб дзейнасці партый

Законы накіраваны на ўрэгуляванне сферы ўзаемадзеяння дзяржаўных органаў (арганізацый) і грамадзянскай супольнасці, удасканаленне падыходаў да стварэння і дзейнасці палітычных партый і іншых грамадскіх аб'яднанняў.

Законам «Аб асновах грамадзянскай супольнасці» вызначаюцца асобыя формы ўзаемадзеяння дзяржаўных органаў (арганізацый) і суб'ектаў грамадзянскай супольнасці: абранне дэлегатаў Усебеларускага народнага сходу, збор і выпрацоўка прапаноў на абмеркаванне ва УНС, удзел у рэалізацыі яго рашэнняў. Правам на ўзаемадзеянне з дзяржорганамі ў асобых формах надзяляюцца суб'екты грамадзянскай супольнасці, зарэгістраваныя ў парадку, устаноўленым заканадаўствам, якія маюць абласныя і Мінскую гарадскую арганізацыйныя структуры, валодаюць колькасцю не менш як 100 тысяч паўналетніх грамадзян (для грамадскіх аб'яднанняў), аб'ядноўваюць у сваім складзе не менш за палову зарэгістраваных у Беларусі прафесійных саюзаў (для прафсаюзаў).

Законам «Аб змяненні законаў па пытаннях дзейнасці палітычных партый і іншых грамадскіх аб'яднанняў» вызначаны ўніверсальныя асноўныя мэты і задачы палітычных партый, якія павінны быць замацаваны ў іх статутах разам з іншымі, спецыфічнымі для кожнай партыі. Прадугледжваецца змена ўмоў стварэння і дзейнасці палітычных партый: павялічваецца мінімальны парог колькасці заснавальнікаў (членаў) з 1 тысячы да 5 тысяч чалавек, устанаўліваецца абавязковая наяўнасць арганізацыйных структур ва ўсіх абласцях і Мінску, а таксама не менш як у адной трэці раёнаў кожнай з абласцей і не менш як у адной трэці раёнаў Мінска. У адпаведнасці з законам, Міністэрства юстыцыі на працягу шасці месяцаў пасля ўступлення яго ў сілу павінна перарэгістраваць палітычныя партыі. Дзейнасць партый, якія не прайшлі перарэгістрацыю і не прынялі рашэнне аб ліквідацыі, будзе спынена па рашэнні Вярхоўнага суда.

Акрамя таго, павышаюцца патрабаванні да рэспубліканскіх і міжнародных грамадскіх аб'яднанняў, дэталізуюцца іх правы і абавязкі. Рэспубліканскія аб'яднанні павінны мець арганізацыйныя структуры ва ўсіх абласцях Беларусі і Мінску, міжнародныя — не толькі за мяжой, але і ў нашай краіне. Аб'яднанням, зарэгістраваным да ўступлення ў сілу закона, на працягу аднаго года неабходна прывесці свае ўстаноўчыя дакументы ў адпаведнасць з яго патрабаваннямі.

Паводле прэс-службы Прэзідэнта.

Прававы аспект

На прынцыпах законнасці і справядлівасці

У Мінску абмеркавалі асаблівасці беларускага правасуддзя і трансфармацыю нацыянальнага права ва ўмовах сучасных выклікаў

Адным з мерапрыемстваў, прымеркаваных да стагоддзя Вярхоўнага суда, стала Міжнародная навукова-практычная канферэнцыя «Беларускае правасуддзе: гістарычны вопыт і сучаснасць», якая ўчора адбылася ў Мінску. Ва ўзаемадзеянні з Беларускім дзяржаўным універсітэтам Вярхоўны суд арганізаваў цікавую дыскусію, за якой сабраліся кіраўнікі дзяржаўных органаў краіны, кіраўнікі і суддзі Суда ЕАЭС, Эканамічнага суда СНД, Вярхоўнага суда Расійскай Федэрацыі, прадстаўнікі навуковай супольнасці — усяго, у тым ліку ў рэжыме анлайн, удзел у канферэнцыі ўзяло каля 200 чалавек.

Фота Бел.ТА.

За 30-гадовы перыяд станаўлення беларускай дзяржаўнасці, а адпаведна, і нацыянальнай мадэлі правасуддзя, прадстаўнікам нашай судовай сістэмы ёсць чым падзяліцца са сваімі калегамі з іншых краін. Як звярнуў увагу **старшыня Вярхоўнага суда Беларусі Валянцін СУКАЛА**, беларускі вопыт выклікае пэўную цікавасць за мяжой. У той жа час прадстаўнікі айчыннага судоваг блока ўважліва адсочваюць тэндэнцыі ў развіцці сусветнага правасуддзя. «Уважліва вывучаем, вядома, найлепшае ўспрымаем, але слепа не капіруем, — заўважыў старшыня Вярхоўнага суда. — У нас свой шлях, свае асаблівасці судовай рэформы».

Як адзначыла **Старшыня Савета Рэспублікі Наталля КАЧАНАВА,** комплексны ўлік і баланс дзяржаўных і грамадскіх інтарэсаў, правоў і свабод грамадзян і, як вынік, сацыяльная справядлівасць, запыт на якую ва ўсім свеце каласальны, — гэта не толькі прынцып работы айчыннага правасуддзя, але і найважнейшы складнік ідэалогіі нашай дзяржавы. «Асноваў беларускай мадэлі правасуддзя з'яўляецца яе народны характар, — падкрэсліла спікер верхняй палаты парламента. — Як і ўсе галіны дзяржаўнай улады, суды накіраваны на ўважлівае стаўленне да сацыяльных патрэб, вырашэнне надзённых пытанняў жыццядзейнасці кожнага чалавека».

Прынятыя на рэспубліканскім рэферэндуме канстытуцыйныя навацыі па надзяленні Усебеларускага народнага сходу паўнамоцтвамі па абранні і вызваленні ад пасады суддзяў Канстытуцыйнага і Вярхоўнага судоў, па словах Наталлі Качанавай, закліканы яшчэ больш узмацніць ролю народаўладдзя. «З упэўненасцю можна канстатаваць, што наш унікальны курс фарміравання судовай сістэмы абсалютна сябе апраўдаў», — заўважыла Старшыня Савета Рэспублікі.

— Устойлівая, незалежная і эфектыўная судовая ўлада — адна з найважнейшых апор дзяржавы ва ўмацаванні суверэнітэту і забеспячэнні паступальнага развіцця, — акцэнтаваў увагу **Старшыня Палаты прадстаўнікоў Уладзімір АНДРЭЙЧАНКА.**

Спікер ніжняй палаты парламента заўважыў, што, азіраючыся на пройдзены шлях, можна з упэўненасцю сказаць: выбраная стратэгія аптымізацыі дзейнасці судоў агульнай юрысдыкцыі даказала сваю эфектыўнасць. «Дзякуючы ёй у краіне дасягнуты прававая і сацыяльная стабільнасць, высокі ўзровень законнасці і правапарадку, — падкрэсліў ён. — Пад кіраўніцтвам Вярхоўнага суда сістэма агульных судоў Беларусі паспяхова спраўляецца з задачамі па забеспячэнні даступнасці і адкрытасці правасуддзя, зацвярджэнні ў беларускай дзяржаўнасці і нацыянальнай прававой сістэмы. «Вярхоўны суд годна прайшоў усе этапы складанага шляху эвалюцыі за 100 гадоў, — удакладніла яна. — Можна з упэўненасцю сказаць, што станаўленне і развіццё сістэмы судоў агульнай юрысдыкцыі і высокая роля Вярхоўнага суда ў сістэме органаў дзяржаўнай улады непасрэдна звязаны з дзейнасцю Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Аляксандра Лукашэнкі, які з моманту выбрання яго ў якасці Прэзідэнта нязменна ўважліва і дакладна ставіўся да судовай сістэмы ў цэлым і да Вярхоўнага суда ў прыватнасці».

Акрамя ўдакладнення ролі кіраўніка дзяржавы ў фарміраванні і ўмацаванні судовай сістэмы краіны, падчас канферэнцыі былі абмеркаваны пытанні ўзаемадзеяння судовай і заканадаўчай улады ў кантэксце развіцця нацыянальнага права, трансфармацыі юрыдычнай адукацыі ва ўмовах сучасных выклікаў, асноўныя вынікі рэформавання сістэмы судоў агульнай юрысдыкцыі Беларусі.

Вераніка КАНЮТА.

Кантэкст

Шанхайскім шляхам

Беларусь упэўнена крочыць да членства ў ШАС

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка падпісаў указ, якім адобраны праект мемарандума аб абавязацельствах Беларусі ў мэтах атрымання статусу дзяржавы — члена Шанхайскай арганізацыі супрацоўніцтва. Аб гэтым паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара.

З 2010 года Беларусь з'яўляецца партнёрам па дыялогу ШАС, а з 2015-га мае статус наглядальніка пры арганізацыі. Летась распачата працэдура прыёму нашай краіны ў члены ШАС. Для афармлення ўдзелу трэба падпісаць і ратыфікаваць мемарандум, а таксама далучыцца да шэрагу дакументаў, якія складаюць дагаворна-прававую базу гэтага інтэграцыйнага аб'яднання.

Праектам мемарандума вызначаны агульныя абавязацельствы Беларусі выконваць мэты і прынцыпы міжнародных дагавораў, прынятых у ШАС, тэрміны далучэння да такіх дагавораў, фінансавыя аспекты ўступлення ў арганізацыю, а таксама палажэнні аб замяшчэнні квотных пасад у яе органах. Паўнамоцтвы на падпісанне мемарандума аддадзены Міністэрству замежных спраў.

Як вядома, Шанхайская арганізацыя супрацоўніцтва — найбуйнейшая сусветная рэгіянальная платформа ўзаемадзеяння. Пра яе стварэнне было абвешчана 15 чэрвеня 2001 года ў Шанхаі Казахстанам, Кыргызстанам, Кітаем, Расіяй, Таджыкістанам і Узбекістанам. Да гэтага краіны працавалі ў фармацэ «Шанхайскай пяцёркі» — без Узбекістана. Палітычнае аб'яднанне было заснавана на Пагадненні аб умацаванні даверу ў ваеннай галіне ў раёне граніцы (Шанхай, 1996 год) і Пагадненні аб узаемным скарачэнні ўзброеных сіл у раёне граніцы (Масква, 1997 год). Цяпер яе членамі з'яўляюцца восем краін (акрамя заснавальнікаў, гэта Індыя і Пакістан, якія таксама далучыліся ў 2017-м) з агульным насельніцтвам больш чым тры мільярды чалавек, якія фарміруюць чвэрць глабальнага ВУП. У 2021-м быў пачаты працэс павышэння статусу Ірана ў складзе арганізацыі да ўзроўню дзяржавы-члена.

З 2010 года наша краіна з'яўляецца партнёрам па дыялогу, а з 2015-га мае статус афіцыйнага наглядальніка ШАС. Рашэнне аб пачатку працэдуры прыёму Беларусі ў арганізацыю аднагалосна было прынята на пасяджэнні Савета кіраўнікоў дзяржаў — членаў ШАС у Самаркандзе ў верасні мінулага года. «Шанхайская арганізацыя супрацоўніцтва ператвараецца з рэгіянальнай арганізацыі ў глабальную. І самае галоўнае цяпер — не ўпусціць гэты момант. Трэба даць шанц тым дзяржавам (іх нямала) для таго, каб яны маглі знайсці альтэрнатыву існуючым рэаліям. Нашая арганізацыя можа стаць глабальнай. Аб'ектыўна стаць. І вырашаць глабальныя праблемы светаўладкавання ў сучасных умовах. Трэба не спазніцца, зламіць гэты момант і адэкватна на гэта адказаць», — адзначыў у сваім выступленні на пасяджэнні Савета кіраўнікоў дзяржаў — членаў ШАС у Самаркандзе Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка.

Паводле палажэння аб прыёме новых членаў у ШАС, дзяржава-заяўнік павінна далучыцца да дзейных у арганізацыі міжнародных дагавораў (а іх каля 40), унесці неабходныя змяненні ў нацыянальнае заканадаўства. «Мы за год зробім, — паставіў задачу беларускі лідар. — І як толькі мы прымем усё, што там напрацавана, яны ўсю гэту інфармацыю збяруць — і ў Дэлі — на стол кіраўнікам дзяржаў. Ёсць — мы становімся членамі. Гэты шлях усе павінны прайсці».

У мінулым месяцы ў Варанасі (Індыя) прайшлі кансультацыі ўпаўнаважаных прадстаўнікоў дзяржаў — членаў Шанхайскай арганізацыі супрацоўніцтва з упаўнаважаным прадстаўніком Беларусі. У мерапрыемстве ўзяў удзел начальнік галоўнага ўпраўлення Азіі, Афрыкі і Лацінскай Амерыкі Міністэрства замежных спраў Беларусі Ігар Белы, паведамілі ў прэс-службе МЗС. «Беларусь мэтанакіравана ішла да паўнапраўнага членства ў Шанхайскай арганізацыі супрацоўніцтва. Мы былі партнёрамі па дыялогу, потым сталі назіральнікамі. Як толькі станем поўнафарматнымі членамі ШАС, атрымаем доступ да ўсіх праектаў, да ўсіх дамоўленасцяў, а таксама да двухбаковых і шматбаковых праектаў, якія рэалізоўваюцца», — растлумачыў раней Ігар Белы.

Па выніках кансультацый паміж дзяржавамі — членамі ШАС і Беларуссю быў падпісаны пратакол. У ім, у прыватнасці, адзначалася, што Беларусь гатова да паскарэння выканання міжнародна-юрыдычных працэдур для ўступлення ў Шанхайскую арганізацыю супрацоўніцтва ў якасці паўнапраўнага члена. Падпісанне Прэзідэнтам указа, якім адобраны праект мемарандума аб абавязацельствах Беларусі ў мэтах атрымання статусу дзяржавы — члена ШАС, — важны крок у гэтым кірунку.

Шанхайская арганізацыя супрацоўніцтва дае рэальную пляцоўку для раўнапраўнага, паважлівага дыялогу. Аб гэтым Прэзідэнт Беларусі заявіў летась на гістарычным пасяджэнні Савета кіраўнікоў дзяржаў ШАС у Самаркандзе, дзе была адобрана заяўка нашай краіны на членства ў ШАС. «Выконваючы базавыя мэты і прынцыпы, Шанхайская арганізацыя супрацоўніцтва дае рэальную пляцоўку для раўнапраўнага, паважлівага дыялогу», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. Паводле слоў Прэзідэнта, ва ўмовах кардынальных змяненняў у глабальным светаўладкаванні і санкцыйных войнаў, развязаных Захадам, у арганізацыі выпрацоўваюцца цывілізаваныя падыходы да вырашэння актуальных міжнародных і рэгіянальных пытанняў. «Перакананы, «шанхайскі дух» і ўсебаковае супрацоўніцтва могуць стаць моцным падмуркам для новай архітэктуры свету», — адзначыў кіраўнік дзяржавы.

Мікалай ЛІТВІНАЎ.

Прыклад бескарыслівага служэння чалавецтву

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Па словах Прэзідэнта, ветэраны вайны ў Афганістане як ніхто іншы ведаюць рэальную цану міру і стваральнай працы. «На працягу ўсіх гадоў незалежнасці нашай дзяржавы вы з'яўляецеся яе надзейнай апорай, дастойным арыенцірам для маладога пакалення», — звяртаючыся да воінаў-інтэрнацыяналістаў, падкрэсліў беларускі лідар.

Як заўважыў у размове з журналістамі **намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Ігар ЛУЦКІ,** сучасны свет прымушае нас па-іншаму паглядзець на тое, што адбывалася больш за трыццаць гадоў таму. «Праблема барацьбы з тэрарызмам, наркагандлем нікуды не сышла, — адзначыў ён. — Тады Савецкі Саюз, нашы маладыя хлопцы, нашы воіны паказалі прыклад мужнасці, вернасці воінскаму абавязку, воінскай прысязе. Тады мы не проста адстойвалі інтарэсы вялікай краіны — мы адстойвалі інтарэсы міру».

Ігар Луцкі падкрэсліў, што Савецкая Армія не проста зайшла ў Афганістан з нейкімі інвестыцыямі, як робяць ЗША і іх прыхільнікі. «Я называю гэта інвестыцыямі смерці — мы бачым, што адбываецца ва Украіне, — канкрэтызаваў намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта. — У той час у Афганістан мы прыйшлі з урачамі, настаўнікамі, мы дапамагалі будаваць краіну. Што ў выніку? Нам не далі тое зрабіць. Сёння мы бачым, наколькі свет неспакойны, нестабільны. Самае важнае, каб гэта не паўтарылася. Дзяржава робіць усё для гэтага. Прэзідэнт гаворыць, што трэба рабіць на сваім месцы сваю работу. Будзе моцная краіна, будзе згуртаваны народ — будзе мір і згода. Мы заўсёды гаворым, што Беларусь — краіна мірная і за мір».

Як паведаміў **старшыня Беларускага саюза ветэранаў вайны ў Афганістане, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы Валерый ГАЙДУКЕВІЧ,** напярэдадні Дня памяці воінаў-інтэрнацыяналістаў у многіх навучальных установах па ўсёй краіне прайшлі ўрокі мужнасці, у якіх бралі ўдзел актывісты Беларускага саюза ветэранаў Афганістана. «Мы праводзім такія мерапрыемствы не толькі да Дня памяці 15 лютага, але стараемся зрабіць так, каб нашы ветэраны бралі актыўны ўдзел у патрыятычным выхаванні моладзі, які атрымаў новы імпульс у краіне, на пастаяннай аснове, — заўважыў ён. — Менавіта ў такім узросце зараджаецца патрыятызм, дзеці становяцца дастойнымі прадаўжальнікамі ідэй сваіх дзядоў і прадзедаў. Каб абараняць радзіму, трэба ўмець яе абараняць. А хто можа расказаць і навучыць? Толькі тыя людзі, якія непасрэдна бралі ўдзел у баявых дзеяннях і са зброяй у руках адстойвалі інтарэсы дзяржавы».

Міністр абароны Віктар ХРЭНІН звярнуў увагу на тое, што на працягу многіх гадоў не сціхалі спрэчкі аб афганскай вайне. Былі і тыя, хто спрабаваў ачарніць подзвіг нашых воінаў, аддаць забыццю памяць загінулых. «Але яны не ведаюць аб тым, што праўду аддаць забыццю немагчыма, — падкрэсліў кіраўнік абароннага ведамства. — Праўда на баку нашых салдат і афіцэраў, якія з гонарам выканалі свой воінскі абавязак. Праўда на баку жывых сведкаў той вайны, якія сёння стаяць сярод нас. Праўда на баку тых, хто ўжо ніколі не вернецца з далёкіх афганскіх гор. Памяць аб іх выпалена ў нашых сэрцах і думках. Мы памятаем кожнага».

Міністр абароны адзначыў, што сёння ва ўмовах новых пагроз менавіта воіны-«афганцы» з'яўляюцца апорай беларускай дзяржаўнасці, бо менавіта яны не на словах, а на справе даказалі сваю высокую грамадзянскую пазіцыю. «Мы абавязаныя на прыкладах доблесці і стойкасці воінаў-«афганцаў» выхоўваць сёння маладое пакаленне, — перакананы Віктар Хрэнін. — Воіны-«афганцы» ведаюць, наколькі нетрывалы мір і як лёгка яго можна страціць».

Вераніка КАНЮТА.
Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.

Шанаваць памяць, падтрымліваць ветэранаў

У Брэсцкім аблвыканкаме правялі сустрэчу з актывам грамадскай арганізацыі воінаў-інтэрнацыяналістаў

Напярэдадні Дня памяці воінаў-інтэрнацыяналістаў у Брэсцкім аблвыканкаме адбылася сустрэча з актывам абласной арганізацыі грамадскага аб'яднання «Беларускі саюз ветэранаў вайны ў Афганістане». З ветэранамі сустрэўся намеснік старшыні аблвыканкама Вадзім КРАЎЧУК.

Віцэ-губернатар адзначыў, што ў вобласці сёння пражывае больш за чатыры тысячы воінаў-інтэрнацыяналістаў, каля тысячы з іх маюць баявыя ўзнагароды. У сярэдзіне лютага ў рэгіёне традыцыйна праходзяць памятныя мерапрыемствы. На думку Вадзіма Краўчука, апошнім часам добра зарэкамендавала сябе такая форма работы ветэранаў з маладымі, як дыялогавая пляцоўка: «Ветэранаў Вялікай Айчыннай становіцца ўсё менш, прыходзіць той час, калі менавіта воіны-інтэрнацыяналісты могуць данесці да свядомасці падрастаючага пакалення праўду пра вайну і найвышэйшую каштоўнасць — мір».

На сустрэчы ўзнімаліся пытанні змянення заканадаўства, якое датычыцца льгот ветэранам баявых дзеянняў. Гаворка ідзе, напрыклад, пра бясплатны праезд у гарадскім транспарце, забеспячэнне лекамі і некаторымі медыцынскімі паслугамі, штогадовае санаторна-курортнае лячэнне, ільготы пры аплаце камунальных паслуг. Гэта выглядае асабліва актуальным у святле будучага разгляду змяненняў у Закон аб ветэранах у Палаце прадстаўнікоў Парламента краіны.

Старшыня Брэсцкай абласной арганізацыі ГА «Беларускі саюз ветэранаў вайны ў Афганістане» Юрый Караба расказаў, што арганізацыя налічвае 1580 чалавек. Але грамадскае аб'яднанне стараецца па магчымасці дапамагаць усім, у тым ліку тым, хто з розных прычын не ўдзельнічае у грамадскім руху. Пад асаблівай увагай — удовы і маці загінулых, а таксама інваліды.

На сустрэчы шмат увагі было ўдзелена пытанням захавання памяці пра тых, хто з гонарам выканаў свой вайсковы абавязак. Вадзім Краўчук паведаміў, што ў кожным раёне адной-двум навучальным установам будзе прысвоена імя воінаў-інтэрнацыяналістаў, і папрасіў кіраўнікоў раённых арганізацый унесці свае прапановы наконт кандыдатур і навучальных устаноў. Гэта асабліва важна зрабіць сёлета, у Год міру і стварэння. Кіраўнік Брэсцкай гарадской арганізацыі Сяргей Пухальскі агучыў прапанову адкрыць у абласным цэнтры кадэцкае вучылішча.

Святлана ЯСКЕВІЧ.
Фота Валерыя КАРАЛЯ.

Па сутнасці

У ХАТУ БАЦЬКОЎ

Файна было спета: паміж Польшчай і Расіяй, між Літвой і Украінай — полька беларуская. Гэта не толькі пра танцы, а пра беларускі лад. Так было, пакуль не пачалі некаторыя скакаць пад чужую дудку. Але чаму «пачалі» — з некаторымі так было заўжды. Гісторыя нашай дзяржаўнасці — гэта гісторыя ўцягвання беларусаў у розныя канфлікты. Шведскія парадкі, польскія амбіцыі, жудасныя германскія праекты. З розных прычын некаторыя аказваліся ў абозах Ілжэдзмітрыя, у камандах карнікаў. Хтосьці — з мэтай пажывіцца, выратаваць сваю скуру, хтосьці — з асабістых меркаванняў, з-за крыўды, напрыклад. Але гэта заўжды была пастка. Заўжды была адна роля — калабарантаў, якія рухаюцца супраць усходняга суседа. Дрэнная роля. А найгоршая — калі супраць сваіх жа. У зондэркамандах.

Кажуць, што беларусаў падзялюў 2020-ы. Хлусня. Беларусаў не год падзялюў, беларусаў падзялілі тэхналогіі. Бо заўжды было так. Адны глядзелі на ўсход, другія — на захад. Адным даспадобы Дастаеўскі, другім — Оруэл. Але жылі пад адным сцягам і ў межах адной краіны. Мы жылі спакойна, клапоцячыся пра дабрабыт. А сілы, якім тое не падабалася, працавалі з настроямі грамадства. Пасля агульнай «сеткалізацыі» сацыяльнымі медыя рабіць гэта стала значна лягчэй. У матэматычнай прагрэсіі. Гістарычныя фэйкі, эканамічныя абяцанкі, наогул дамінаванне заходніх мадэляў паводзін ляпілі з нас гэткіх беларускіх «адэптаў перамен». Праўда, ніхто не казаў пра заходняга цмока, які ласуецца чужымі багаццямі, у тым ліку і нашымі. Колькі разоў раней захопнік адтуль зямлю нашу вяртаў да стану зямлянак? А мы зноў аднаўляліся. Вось наш, што называецца, недаатрыманы прыбытак. А як падлічыць людскія страты? Мільёны загінулых падчас заходняй экспансіі, мільёны ненароджаных. Гэта якая б велічыня была ў краіны?! Страчаная спадчына. Імкнучыся ў еўрапейскую бездань, людзі губляюць сябе. А ім убілі ў галовы, што менавіта яны валодаюць самай выключнай і правільнай інфармацыяй. Ад таго і найменне такое — «неверагодныя». А яшчэ ў сквапныя кіпцюры ворагі Беларусі прыбралі да сябе тэму беларускай ідэі ды ўжо якое дзесяцігоддзе запар эксплуатуюць яе. І вось з таго часу святыя нацыяльныя наратывы выкарыстоўваюць у сваіх брудных палітычных мэтах. Але цяпер тыя нібыта барацьбіты за беларускасць самі ператварыліся ў чужынцаў — недасведчаных касмапалітаў, якіх, згодна з класікам, трэба «біць у сэрца мячамі».

Я не кажу, што ў саюзе з Расіяй, сябруючы з усім светам, мы будзем мець усё. Не. Трэба працаваць, адстойваць свае інтарэсы. Яшчэ і таму, што шмат краін сёння капіталістычнага ўкладу. А мы — сацыяльная краіна. З таго, што маем, і атрымліваем. Падчас вялікага перадзелу свету гэта вельмі смелая пазіцыя. Таму пра нас не забудуць. Каб збіць з курсу, будуць абяцаць райскія шаты, а на мэце — загнаць пад лаўку. Ужо не з адной краінай так зрабілі. Кажучы нашай мовай, абяцанкі-цацанкі, а дурню радасць.

Жылі сабе і не думалі, што жывём лепей шмат за каго. Турызм у класічную Еўропу на Каляды ды адпачынак на заморскіх берагах — прываблівае. Жыццё ў ерапейскай рэчаіснасці ў якасці пастаяльцаў хостэлаў — іншае. Так і атрымалася з жадаючымі спаліць хату бацькоў. Некаторыя нават і па руках атрымалі. А цяпер тая хата ў парадку. Можна і вярнуцца. З замежжа. Бо, як было некалі, так і цяпер паўтараецца. Час кветачак прайшоў, нам абяцаюць ягадкі. На сцежку вайны — пакуль медыйную — выходзяць радыкалы. Яны і не хаваюць — гатовыя пакінуць у Беларусі крывавы след. Як іхнія куміры — калабаранты — рабілі тое раней. Не так даўно, каб забыцца. На жаль, некаторыя забыліся. Альбо наогул не ведалі. Чаму так і дабіваюцца нашы ворагі, каб знак роўнасці ставіць паміж савецкім героем і нацысцкім эсэсаўцам. А чаго здзіўляцца — калі нават сведкі сённяшніх падзей ацэньваюць гэтыя самыя падзеі праз прызму сацыяльных сетак. Вось у якую прорву яны трапілі.

Фэйкавым лідарам тыя, хто на захад ад Буга, неабходныя для асабістага камфортнага існавання. Для легітымізацыі свайго палітычнага капіталу і нават фінансавання сваіх рахункаў. Час, калі «гуманісты Еўропы» кармілі збеглых, мінуў. Некаторыя ў гэтай цеснай пастцы знайшлі работу — звычайна, тую, якой грэбуе «паньства». А астатнія? Выйсце ёсць. Святло ў канцы гэтага тунэля запаліў Прэзідэнт. Гэта шанц вярнуцца да дастойнага жыцця тым, хто ішоў супраць яго.

Прачынайцеся, расплюшчвайце вочы. Пакуль на фронце не апынуліся. Бо, бітва за вас ужо пачалася. Гэта, насамрэч, украдзены выбар. Альбо за варшаўскі, альбо за літоўскі, альбо ў гурце пазнякоўца — як у пачатку 1990-х — шпацыр на пагост.

Дамоў. Хутчэй, пакуль orzel bialy не выдзеўбе вочы. Па праўдзе кажучы, не ўсім і трэба. Тым, хто прадаўся, — сядзіце ўжо там. Не трэба ганьбіць зямлю Бацькаўшчыны. А тыя, хто зразумеў, што ад чужога хлеба сыты не будзеш, — шанц маюць. Радзіма чакае. Тым, хто, шукаючы раю, рушыў у вырай, — час вяртацца дамоў. Тут і вада, і хлеб смачнейшыя і нават салодкія. Ці не чулі:

Каб любіць Беларусь нашу мілую,
Трэба ў розных краях пабываць.
Разумею цяпер, чаму з выраю
Жураўлі на Палессе ляцяць.

Хутка вясна. Птушкі вяртаюцца ў гнёзды.

Яўген ПУСТАВОЙ.

Беларускі прафесійны саюз работнікаў культуры, інфармацыі, спорту і турызму выказвае глыбокія спачуванні Уладзіміру Барысавічу Пярцову, міністру інфармацыі Рэспублікі Беларусь, у сувязі з горам, якое напаткала яго, — смерцю МАЦІ.

ШТО ВЫЛЕЧВАЕ АД КОМПЛЕКСУ МІЗЭРНАСЦІ

З Ігарам МАРЗАЛЮКОМ, старшынёй Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па адукацыі, культуры і навуцы, доктарам гістарычных навук, прафесарам, членам-карэспандэнтам НАН, гутарка была задуманая на канкрэтную тэму. Меркавалася, што размова пойдзе аб новым курсе «Гісторыя беларускай дзяржаўнасці», які з гэтага года пачалі выкладаць у ВНУ, і аб аднайменным дапаможніку (Ігар Аляксандравіч — адзін з ініцыятараў увядзення гэтага курса і адзін з аўтараў падручніка). Але гэта быў якраз той выпадак, калі з асобнага пераходзіш да агульнага, бо ад яго, гэтага асобнага, агульнае ў многім і залежыць...

— Ігар Аляксандравіч, я зараз выкажу думку хутчэй не журналіста, а, скажам так, адукаванага абывацеля. Мне здаецца, што з увядзеннем курса «Гісторыя беларускай дзяржаўнасці» ў адукацыйную сістэму мы спазніліся гадоў на дваццаць, калі не больш...

— Давайце скажам шчыра: у 1990-х — і нават не ў пачатку, а пазней — у сістэме адукацыі існавала зняважліва-пагардлівае стаўленне да гуманітарнага блока дысцыплін. Лічылася, што галоўнае — фізіка, матэматыка, ну, яшчэ замежная мова. Так званая рэформа сацыяльна-гуманітарных дысцыплін, якая ў нас была да нядаўняга часу, прывяла да інтэлектуальнага збяднення, у тым ліку і тых, хто будзе заўтра кіраваць дзяржавай. Курс гісторыі Беларусі, які выкладалі ў вышэйшай школе, быў спрошчаным рафінаваным варыянтам курса сярэдняй школы. І які ў гэтым быў сэнс? Ідэя ўдасканальвання выкладання сацыяльна-гуманітарнага блока з'явілася ў нас з Ігарам Васілевічам Карпенкам, які ў той час быў міністрам адукацыі. Была створана рабочая група пад маім кіраўніцтвам, у ёй былі сабраныя найлепшыя гуманітарыі. І мы прыйшлі да высновы, што патрэбна дысцыпліна, якая ўяўляла б сабой сінтэз палітычнай, сацыяльнай, гістарычнай, светапогляднай дысцыплін. Менавіта такой дысцыплінай заклікана стаць гісторыя беларускай дзяржаўнасці. Яна адказвае на тры фундаментальныя пытанні: адкуль мы? чаму мы такія, як ёсць? як нам будаваць стратэгію нашай будучыні? Па сутнасці, аднайменны дапаможнік — гэта першы за ўсю гісторыю дзяржавы сістэмны падручнік, дзе паказана гісторыя ўзнікнення і развіцця беларускай суб'ектнасці — палітычнай, эканамічнай, культурнай — праз эвалюцыю дзяржавы, дзяржаўных інстытутаў, а таксама тых этнічных супольнасцяў, якія сёння ўсе разам утвараюць беларускую нацыю...

— Фактычна адказ на вечнае Купалава і наша агульнае: «А хто там ідзе?»...

— Я калісьці ў мемуарах Шарля дэ Голя прачытаў адну вельмі цікавую думку. Ён, нашчадак старажытнага рыцарскага роду, напісаў: «Я рос у атмасферы вечнасці Францыі». Я хачу, каб гэтым падручнікам мы стварылі ў моладзі атмасферу гістарычнай вечнасці Беларусі. Каб яны разумелі, што Беларусь не ўчора з'явілася і заўтра не знікне. Што існаванне на палітычнай карце свету беларускай дзяржавы — гэта вынік працы і намаганняў нашых продкаў, што ў нашай дзяржаўнасці вялікая пісьмовая гісторыя.

У гэтым падручніку няма нейкіх этнічных фобій, нянавісці, знявагі. Але можна сказаць, што гэты падручнік — тое, што вылечвае ад комплексу мізэрнасці. Мы не прапусцілі ніводнага моманту развіцця нашай дзяржаўнасці. Напрыклад, у першым раздзеле, прысвечаным этапам гэтага развіцця, ёсць усё: пачынаючы ад Полацка і Турава і да нашых дзён. Другі раздзел прысвечаны гісторыі дзяржаўных інстытутаў: тут і Полацкая праўда, і статуты ВКЛ, і судзебнікі, і ўстаўныя граматы БНР, і ўсе рэдакцыі Канстытуцыі БССР, і цяперашняя Канстытуцыя. Расказваем пра інстытут кіраўніка дзяржавы — пачынаем з князя, заканчваем Прэзідэнтам. Расказваем пра ўрад — ад чыноў княжацкай адміністрацыі эпохі Полацкай зямлі і да сённяшняга Савета Міністраў. Расказваем такім жа чынам і пра судовую ўладу. Усё паказана праз прызму гістарычнай эвалюцыі беларускай дзяржаўнасці, галоўны пасыл — за нашымі цяперашнімі інстытутамі ёсць пэўная традыцыя, і мы гэту традыцыю разбіраем і аналізуем.

Трэці раздзел «Беларусь на мяжы культур і цывілізацый». Тут пра этнагенез беларусаў: якія назвы гэтай тэрыторыі існавалі; якія народнасці тут жылі; супольнасці, якія сёння складаюць сучасную беларускую палітычную нацыю. Згадалі ўсіх: і рускіх стараверaў, і літоўцаў, і цыганоў, і яўрэяў, і татараў. Мы паказваем, як узнікала ўсё тое, што называем беларускім светам і што такое беларуская цярпімасць. Ёсць раздзел, прысвечаны дзяржаўным сімвалам, дзяржаўным святам. Мы не ўнікалі ў ніякія вузкія, нязручныя моманты. Расказваем падрабязна, якія сцягі існавалі ў гісторыі Беларусі, як мянялася сімволіка і чаму, чым быў абумоўлены выбар беларускага народа на розных этапах развіцця тых ці іншых сімвалаў, не прапускаючы ніводнага этапа нашай гісторыі. Частка, прысвечаная сацыяльна-палітычнаму развіццю, расказвае пра палітычнае жыццё ў краіне, пра існуючыя партыі і рухі, пра знешнюю палітыку. Карацей, пра цывілізацыйнае развіццё дзяржавы...

Выданне багата ілюстравана, выканана з улікам найноўшых тэхналогій. Тут шмат QR-кодаў, дзякуючы чаму гэты падручнік — свайго роду праваднік да шматлікіх іншых кніг, тут вывераныя навуковыя аўтарскія карты. Ёсць падрабязная храналагічная табліца гісторыі беларускай дзяржаўнасці. Карацей, зроблена максімальна ўсё, каб падручнік быў зручны і цікавы для маладога чытача. І каб прымушаў яго думаць.

— Лепш позна, чым ніколі?

— Я адкажу, што мы даспелі да гэтага курса, да разумення важнасці гуманітарных дысцыплін ва ўмацаванні нацыянальнай бяспекі. І мы зразумелі, што светапоглядныя рэчы не менш важныя, чым эканоміка. Калі не памыляюся, гэта Леў Талстой сказаў, што Чынгісхан з тэлеграфам — гэта страшна. Дык вось, каб не пладзіць сёння «чынгісханаў з тэлефонамі», мы павінны думаць пра гуманітарны складнік.

У Год гістарычнай памяці быў зроблены вельмі важны крок — створаны Савет па гістарычнай палітыцы пры Адміністрацыі Прэзідэнта. Дарэчы, дапаможнік, пра які гаворым, быў рэкамендаваны саветам. Але гэта першы крок, яшчэ шмат работы наперадзе. Напрыклад, над стварэннем Пантэона нацыянальных герояў, над тэрміналогіяй, над вызначэннем многіх рэчаў, якія выклікаюць спрэчкі ў грамадстве. Трэба зразумець вельмі важную рэч: мы нічога не выкідваем з гісторыі, гістарычная памяць не можа быць фрагментарная і выбарачная. Іншая справа (і самая вялікая праблема) — гэта інтэрпрэтацыя. Хто бандыт, хто герой, хто можа быць культурным сімвалам, на якіх персанажах можна будаваць гістарычную памяць народа. Любы сюжэт патрабуе грунтоўнай прапрацоўкі і папулярызацыі. Прычым абапіраючыся на канкрэтных фактах і дакументах. Нам патрэбна гістарычная катэхізацыя ўсіх груп беларускай нацыі.

— Падзеі 2020 года ўзмацнілі гэта разуменне, паскорылі гэты працэс?

— Мы пачалі гэту важную справу рабіць да 2020 года. Першы, нулявы, варыянт дапаможніка і вучэбная праграма існавалі ўжо ў 2017-м. 2020 год прыпыніў працу над удасканаленым варыянтам, а пасля давялося штосьці і карэкціраваць. Пэўныя рэчы перагледзелі, зрабілі больш выразныя акцэнты на некаторых нюансах, якія да гэтага гучалі не так выразна. Але ў цэлым структура дапаможніка захавалася такой, як была задуманая. Калі стала зразумела, што ў краіне будзе праводзіцца канстытуцыйная рэформа, было вырашана яшчэ адкласці выпуск, каб дапаможнік выйшаў ужо і з яе ўлікам.

— Калі гаварыць пра згаданую вамі інтэрпрэтацыю, падачу канкрэтнай асобы... Для мяне асабіста, бадай, самым моцным шокам 2020-га было выкананне песні «Магутны Божа» на «Яме». Прычым, думаю, тыя, хто спяваў, не разумелі, якое гэта кашчунства...

— А ўсё таму, што ў адраджэнскай беларускамоўнай публіцыстыцы з падачы беларускай амерыканскай эміграцыі існуе цалкам фальшывы вобраз Наталлі Арсенневай, дзе яна малюецца як летуценніца-паэтка, што ў любых абставінах дбала пра беларушчыну і не служыла нікому, толькі высокім мастацкім вартасцям. Зараз хтосьці скажа, што я прапагандыст, які спрабуе ачарніць светлае імя... Панове, як прафесійны гісторык я параю вам звярнуцца да аўтэнтычных пісьмовых дакументаў, якія сведчаць, што чалавек рабіў і чаго не рабіў. У Нацыянальным архіве такія дакументы ёсць, іх шмат — і пра тых, хто супрацоўнічаў з фашыстамі ў час акупацыі Беларусі. Дарэчы, як давялося пабачыць, некаторыя папкі з гэтымі дакументамі ўвогуле нікім не былі прагледжаныя. Заклікаю ўсіх, хто расказвае казкі пра Арсенневу: схадзіце ў архіў. Паглядзіце, кім рэальна быў яе муж і што ён рабіў. Пачытайце газеты, у якіх яна друкавалася. Яе светлы вобраз разбураецца яшчэ да вайны, калі яна нібыта была палымянай савецкай патрыёткай. Пачытайце яе вершы, прысвечаныя памяці Леніна, пачытайце яе «Оду Сталіну»... І пачытайце тое, што яна пісала ўжо ў газетах часоў акупацыі, — убачыце, якой заўзятай антысеміткай яна была, як падтрымлівала гітлераўскі рэжым. Яна ў 1943 годзе выдала зборнік, у якім былі не проста вершы — гэта былі маршавыя песні 13-га беларускага батальёна СД, на сумленні якога пяць гета, карныя аперацыі «Котбус» і «Кармаран»... Пачытайце калабаранцкую «Беларускую газету» — як яны падавалі паражэнне немцаў пад Сталінградам: фашыстаў яны параўноўвалі з дружынамі полацкага Усяслава Чарадзея, які пацярпеў паражэнне на Нямізе, але ўсё-ткі потым заняў Кіеў... Што гэта, як не кашчунства? Вы яшчэ знойдзеце распіску мужа Арсенневай Кушаля аб атрыманні ў карыстанне канфіскаваных яўрэйскіх пярын. Яны спалі на пярынах забітых яўрэяў! І ці можна, ведаючы гэта, спяваць яе верш на месцы масавага знішчэння яўрэяў?.. Хтосьці скажа: пры чым адно да другога — верш жа прыгожы. Безумоўна, прыгожы. Але ў Германіі дагэтуль забароненыя бяскрыўдныя фальклорныя песні — толькі па той прычыне, што яны былі маршавымі песнямі батальёнаў СС... Тое самае можна сказаць і пра дыскрэдытацыю бчб-сцяга — яна на сумленні тых, хто ўрачыста вывешваў яго побач са сцягам са свастыкай... На жаль, мы ў падручніках тэму калабарацыі ўвогуле стараліся абыходзіць. Але як толькі мы замоўчваем падобныя сюжэты, узнікае фальшывае ўяўленне пра палкіх рыцараў, якія нібыта змагаліся з двума таталітарнымі рэжымамі... Пры тым, што ва ўсіх крыніцах, нават нямецкіх, засведчана, што беларускі народ даў у тую вайну найменшую колькасць здраднікаў — пра іх, гэтых здраднікаў, трэба гаварыць і ведаць. Прыклад на «Яме» — гэта якраз і сведчанне таго, што да нядаўняга часу мала гаварылі і ведалі.

— Але 30—35-гадовыя падручнік чытаць ужо не будуць. Як ім усё гэта патлумачыць?

— У папулярнай форме — праз СМІ, праз фільмы, праз кнігі. Прычым не праз мудрагелістыя манаграфіі, напісаныя сухой мовай, а праз, калі хочаце, выклік. Таму што абсалютная большасць беларусаў — усіх пакаленняў — мае трывалую антынацысцкую прышчэпку. Чаму мы так радасна святкуем і, я ўпэўнены, будзем святкаваць 9 Мая і 3 Ліпеня? Таму што для нас гэта літаральна свята жыцця. Мы выжылі як народ толькі дзякуючы таму, што гэтыя даты ў нашай гісторыі адбыліся... Мы павінны апеляваць да такіх зразумелых беларусам паняццяў, як гуманізм, людскасць, і паказваць, што пэўныя сюжэты і пэўныя «героі» з гэтымі паняццямі ніяк не стасуюцца. Гэта павінна быць сістэмная праца, і мы ёй зараз займаемся. Дарэчы, самая эфектыўная форма работы (яна ж, бадай, і самая складаная) — гэта выступленне перад людзьмі, вочы ў вочы, з доказамі, з дакументамі. Вядома, цяжка пераканаць таго, хто свята верыць у нешта. Але людзі павінны ведаць, што хаваецца за той ці іншай падзеяй у гісторыі, што хаваецца за тым ці іншым прозвішчам — і якія ўчынкі рабіў гэты чалавек — за тым ці іншым вершам і для чаго і для каго ён быў напісаны. Гістарычная навука — гэта навука глыбока маральная. Людзі здзяйсняюць амаральныя ўчынкі, але апраўдання такім учынкам не можа быць. Няма такой ідэалогіі, няма такой сімволікі, у імя якой узброены мужчына ў вайсковай форме мае права забіваць дзяцей.

Людзям нельга хлусіць, паўпраўда заўсёды нараджае вялікі недавер. Калі ты нешта сцвярджаеш, ты павінен даказаць гэта фактамі.

— Сваю тэлепраграму «Сімвалы беларускай вечнасці» на СТБ вы назвалі пад уражаннем слоў дэ Голя?

— Так.

— Але ж у ёй не толькі найноўшая гісторыя, але і тое, што адбывалася стагоддзі таму. З дакладнымі фактамі тут больш складана...

— Матэрыяльныя сведчанні пакінулі нават падзеі, якія былі стагоддзі назад, — кнігі, культавыя помнікі і г. д. Важна кіравацца менавіта імі, ствараючы рэканструкцыю далёкай эпохі. Пры гэтым падаваць для тэлеаўдыторыі найбольш проста і зразумела. Займацца папулярызацыяй навукі — задача вельмі складаная.

— Нядаўна давялося ад вас пачуць «канцэпцыя гістарычнай памяці». Гэта паняцце філасофскае ці ўсё ж мае шанцы стаць паняццем палітычным — на ўзроўні нарматыўнага дакумента?

— Гэта міжнародная практыка — нарматыўна замацаваны, зацверджаны законам афіцыйны погляд дзяржавы на найважнейшыя падзеі ў гісторыі той ці іншай нацыі, якія ўплываюць на дзень сённяшні, ілжывая інтэрпрэтацыя якіх успрымаецца як нацыянальная абраза і праследуецца па законе. Такія законы, якія існуюць у многіх краінах, называюцца мемарыяльнымі. У нас, як прыклад да сказанага: узмацненне на заканадаўчым узроўні адказнасці за прапаганду нацызму і нацысцкіх сімвалаў, Закон «Аб генацыдзе беларускага народа». Менавіта з падобных мемарыяльных законаў і можа скласціся ўрэшце канцэпцыя гістарычнай памяці. Мы тут не першапраходцы. Паглядзіце, колькі падобных законаў у Польшчы, як строга там усё рэгламентуецца, там ёсць цэлы Інстытут нацыянальнай памяці. На мой погляд, і нам патрэбна падобная структура, і рана ці позна мы яе створым. Сёння, па сутнасці, яе функцыі выконвае ўжо згаданы Савет па гістарычнай палітыцы. Нам трэба гэтым займацца, бо менавіта сёння здзейснілася мара шматлікіх пакаленняў беларусаў: мы маем сваю незалежную дзяржаву, якая моцна стаіць на нагах. Але гэта плён працы ўсіх пакаленняў, і мы павінны пра гэта ведаць і памятаць. Мы вяртаемся да саміх сябе. Мы фантастычна паспяховы народ — на працягу крыху больш за сто гадоў прайшлі такі шлях! Нам трэба навучыцца цаніць тое, што маем, любіць сваё, не пагарджаючы чужым. Усё, што мы робім сёння ў гістарычным плане, скіравана на павагу да сябе і да суседзяў і на разуменне велічнасці шляху свайго народа.

— Мы пакуль толькі вучымся гэта разумець.

— Мы вучымся, але мы вельмі добрыя вучні. Беларусы павольна запрагаюць, але вельмі хутка едуць. Мы гэта неаднойчы ў гісторыі даказалі.

Гутарыла Алена ЛЯЎКОВІЧ.

ДАРАЖЫ СВАІМ ЧАСАМ

Год таму мой сябар Алесь вырашыў кардынальна памяняць прафесію. З журналіста пераквалiфікавацца ў тэсціроўшчыка. Запісаўся на адмысловыя праграмісцкія курсы, пайшоў на заняткі, каб падцягнуць англійскую мову. А каб, пакуль вучыцца, мець нейкую капейку, знайшоў падпрацоўку капірайтарам. Пачаў пісаць тэксты для сацсетак пра крыптавалюту. Калі шчыра, я тады вельмі здзівілася яго выбару. Бо нават словы «тэсціроўшчык» і «крыптавалюта» ўвахо-дзілі ў дысананс са схільнасцямі і талентамі маладога чалавека. Алесь — гуманітарый да мозгу касцей, на раз-два прыдумвае чарадзейныя казкі для сваёй дачушкі, цудоўна гатуе і жыць не можа без кветак. Прычым ён не толькі піша пра расліны душэўныя і вобразныя замалёўкі, але і разводзіць іх на лецішчы ў вялікай колькасці. І вось гэты апантаны кветавод вырашыў пайсці ў тэсціроўшчыкі... ды пісаць пра «крыпту».

Днямі мы хадзілі разам у піцэрыю. Алесь падзяліўся, што ў пагоні за вялікімі грашыма ледзь не страціў сябе. «Ведаеш, — кажа, — калі я прыслухаўся да сябе і зразумеў, што праграмаванне — гэта не маё, бы камень з душы скінуў. І навошта мне тыя грошы, калі праца будзе не ў радасць, а жыццё ператворыцца ў катаргу? Я нават цяпер, калі пішу пра крыптавалюту, пакутую. Думаю адмовіцца ад гэтай падпрацоўкі».

Я бачыла даволі шмат паспяховых людзей, захопленых сваім заняткам. Дык вось, грошы для іх, і гэта адчуваецца, не з'яўляюцца вызначальным фактарам. Яны паглыбленыя ў справу свайго жыцця і лёгка выдаткуюць на яе значную частку даходу. Праз нейкі час любімая справа прыносіць ім даход з такой жа лёгкасцю. І наадварот, людзі рэдка дабіваюцца поспеху, калі занятыя тым, што не прыносіць ім задавальнення.

Напрыклад, Віка, па рэцэптах якой я люблю гатаваць, прызналася, што яна з дзяцінства хацела быць кухарам. Але бацькі сказалі, што гэта праца не для дзяўчынкі. Таму Віка паступіла на эканаміста — на той час такая прафесія была самай прэстыжнай. У выніку 4,5 года адпрацавала па спецыяльнасці і ўвесь гэты час ненавідзела тое, што рабіла. Шчаслівая была толькі па вечарах і выхадных на ўласнай кухні, дзе адточвала сваё кулінарнае майстэрства. У выніку чатыры гады таму кінула нелюбімую работу і пачала рухацца ў бок сваёй мары. Цяпер дзяўчына працуе ў дарагім рэстаране шэф-кухарам, улюбляе ў кухарства іншых, праводзячы майстар-класы, вядзе кулінарны блог, па якім гатуе больш як 40 тысяч падпісчыкаў... Кажа, што ловіць кайф кожны свой працоўны дзень. І гэта нядзіўна, бо яшчэ Канфуцый некалі казаў: «Знайдзі сабе працу даспадобы, і табе не давядзецца працаваць ні дня». Нелюбімая работа можа «высушыць» чалавека, давесці яго да стану, калі неблагія сродкі для існавання ёсць, але яны не прыносяць радасці альбо няма часу ці энергіі іх траціць. Гэта даволі сумна, бо грашыма ніколі не заменіш страчаны час. А ён, пагадзіцеся, бяжыць вельмі хутка...

...Адзін банкір назапасіў вялікае багацце за кошт сумленных кліентаў. Аднойчы ён вырашыў, што стаміўся, і хоча пажыць у раскошы як душа жадае. І толькі ён пра тое падумаў, як да яго з нябёсаў спусціўся анёл смерці. Спужаўшыся, банкір вырашыў любым спосабам вытаргаваць сабе крыху часу. «Дай мне тры дні жыцця, і можаш узяць траціну маёй маёмасці!» Анёл адмовіўся. «Ну, добра... Тады я аддам табе палову таго, што ў мяне ёсць, толькі дай мне ўсяго адзін дзень, каб я змог наведаць сям'ю, якую з-за вечнай занятасці даўно не бачыў».

Але анёл быў непахісны. Тады чалавек стаў маліць даць яму хоць бы некалькі хвілін, каб напісаць сыну развітальную запіску. Гэтае жаданне анёл задаволіў. І банкір напісаў: «Сынок, даражы сваім часам. За ўсе свае мільёны долараў я не змог купіць і адной гадзіны».

Надзея ДРЫНДРОЖЫК.

Сямейная газета

Выпуск № 3 (206)

Тыя, хто побач

Мікалай МІРНЫ:

«Я БЫЎ ЗГОДНЫ НА ЎСЁ, ШТО ДАПАМОЖА Ў ТЭНІСНЫМ РАЗВІЦЦІ СЫНА»

12 лютага заслужаны трэнер Рэспублікі Беларусь і заслужаны тэнісны бацька Мікалай Мірны адсвяткаваў дзень нараджэння. І зрабіў падарунак чытачам «Сямейнай газеты» — расказаў, як выхаваць чэмпіёна.

А шлях да тытулаў Вялікага шлема і першага радка сусветнага рэйтынга Максіма Мірнага пачаўся... з прабежак у мінскім мікрараёне Серабранка. Менавіта там Мікалай Мірны выхоўваў у сваім старэйшым сыне сілу духу і працавітасць. «Я ўжо шмат у якіх інтэрв'ю казаў, што ён быў сябрам, настаўнікам, пхальнікам пад зад, крэатыўшчыкам, як сказалі б цяпер. Ён быў для мяне напарнікам у прамым сэнсе гэтага слова. Бацька прафесійна рос разам са мной. Ён фактычна трэніраваўся побач і воляй ці мімаволі навучыўся гуляць у тэніс», — расказваў у інтэрв'ю Максім Мікалаевіч.

Фота БелТА.

У суме 57 тыдняў на вяршыні сусветнага парнага рэйтынгу. Дзесяць Вялікіх шлемаў: шэсць у мужчынскім парным разрадзе і чатыры ў міксце. Дзесяць выступленняў на Выніковым турніры ATP у парным разрадзе, з іх — дзве перамогі. Пяць Алімпіяд, адна алімпійская перамога. Дваццаць пяць сезонаў у складзе нацыянальнай каманды Беларусі, 96 паядынкаў у Кубку Дэвіса, паўфінал. Пяцьдзясят два тытулы ATP у парным разрадзе. Званне заслужанага майстра спорту Рэспублікі Беларусь, ордэн Айчыны III ступені і ордэн Пашаны. Прэмія Tennis Europe Award за значны ўклад у развіццё і папулярызацыю тэніса ў Еўропе. Спецыяльная ўзнагарода Міжнароднай тэніснай федэрацыі The Davis Cup Commitment Award за шматгадовую прыхільнасць да сваёй каманды і самааддачу ў матчах Кубка Дэвіса. Гэта здаецца немагчымым для аднаго чалавека, але гэта рэальныя дасягненні Максіма Мірнага, спартсмена, які на доўгія гады стаў сімвалам беларускага тэніса.

(Заканчэнне на 5-й стар. «СГ».)

Вельмі асабістае

АДШТУРХНУЦЦА АД ДНА

Шукаем пункты апоры разам з мамай «асаблівага» дзіцяці

З Настассяй Унучак я пазнаёмілася амаль 10 гадоў таму, калі яна ўзначальвала медыцынскі цэнтр «Аптымед». Рабіла з лэдзі-бос інтэрв'ю для сваёй кнігі «Сустрэчы без абцасаў». Ужо потым я даведалася, што Настасся выйшла замуж, нарадзіла дачушку Машу, а праз год і адзін месяц — другое дзіця. Міша з'явіўся на свет на 2,5 месяца раней тэрміну, важыў усяго 1470 грамаў. У той момант, як прызналася Настасся, унутры яе не аказалася апоры, каб справіцца з сітуацыяй. Яе перапаўнялі адчай і злосць... За год яна, можна сказаць, апусцілася да самага дна. Але ў нейкі момант знайшла ў сабе сілы, каб адштурхнуцца і падняцца ўверх.

Пра раздзяляльную паласу і шлях Душы

Да 38 гадоў я была абсалютна шчаслівай, паспяховай і зацыкленай на сабе. Спачатку, у 27, я стала дырэктарам медыцынскага цэнтра, потым адкрыла ўласны бізнес — выязны салон прыгажосці. Але пасля нараджэння Мішы маё жыццё падзялілася на «да» і «пасля». І гэта была не проста раздзяляльная паласа. А сапраўдная прорва, у якую я трапіла ў першы год жыцця сына.

Нарадзіўся Міша 29 сакавіка, а дадому мы трапілі толькі ў пачатку чэрвеня. Жылі ў бальніцах. Прагнозы былі амаль адразу несуцяшальныя. Міша прабыў двое сутак у рэанімацыі на апараце штучнай вентыляцыі лёгкіх. У выніку чаго, як сказалі ўрачы, адбылося пашкоджанне галаўнога мозга. Памятаю, як ляжала ў палаце і чытала ў інтэрнэце, якое пекла нас чакае наперадзе. І з кожным днём усё больш упадала ў дэпрэсію.

Раней мне падавалася, што калі ў цябе ёсць поспех у нейкай сферы, то далей усё будзе добра. Пасля нараджэння Мішы я зразумела, што гэта ілюзія. У любы момант з кожным з нас можа здарыцца ўсё, што заўгодна... Менавіта таму важна не нарошчваць вакол сябе знешнюю лупіну, а звяртаць увагу на галоўнае — расці ўнутрана. Бо калі нешта здараецца, знешняе не з'яўляецца апорай.

(Заканчэнне на 3-й стар. «СГ».)

Выхоўваць з дапамогай... маніпуляцый

З тапачкам — кароткі шлях, з перакананнем — доўгі

Гадаваць дзіця — працэс няпросты. І няважна, у поўных ці няпоўных сем'ях гэта адбываецца. Часта бывае, што жыццё больш насычанае эмацыянальна ў сем'ях, дзе толькі адзін з бацькоў, але ёсць клопат пра малога, чым у поўных сем'ях, дзе такога няма. Але і там, і там шмат «бунтаў» дзіцяці, якое лянуецца і не слухае, браць на сябе нічога не хоча ці проста паўстае супраць. Чаго? Ды проста наперакор усяму. Як дзейнічаць бацькам? Праз мадэляванне сітуацый, упэўнены Міхаіл ШУКАЙЛА, які ўзначальвае кірунак па рабоце з падлеткамі бацькоўскага аб'яднання «Клуб ільвоў», медыятар і тата дзвюх дачок.

«Усё роўна ніхто тут не ходзіць!»

Многія хочуць «зручнае» дзіця, бо «зручныя» дзеці — зручныя мэты для маніпулявання, і праз іх можна рэалізаваць свае, не дасягнутыя бацькамі, мэты. Перакананне (не ўгаворы, а менавіта перакананне) — доўгі працэс, але ён працуе. Дыялог з дзіцем — гэта работа, і гэта складана, на гэта трэба знайсці час і жаданне. А вось з выкарыстаннем фізічнага ўздзеяння, калі дзіця ўжо адкрыта «забіла» на аўтарытэт дарослых, калі ў ход ідзе «выхавальны тапачак», каб лепш дайшло, — гэта кароткі шлях для лянівых, перакананы наш суразмоўца, які многія рэчы як медыятар апрабаваў на сваёй сям'і і кажа, што праблемы сапраўды вырашаюцца, калі праявіць цярпенне.

— Лепш астыць, перш чым кідацца ў разборкі, а пасля падысці і спытаць: «Чаму так?» Адказ вядомы: «Таму што!» І тут ужо трэба размаўляць праз мадэляванне сітуацыі. Плюс дадаваць момант маніпуляцыі, асабліва праз фінансавы бок. Сёння яна не хоча засцілаць ложак, бо «ўсё роўна тут ніхто не ходзіць», а заўтра ёй спатрэбяцца новыя навушнікі, і, хочаш не хочаш, яна вымушана будзе дамаўляцца. І трэба гэтага моманту, як тыгр у засадзе, дачакацца — пакуль дзіця, якое «накасячыла», прыйдзе само, — кажа Міхаіл.

Аднак у гэтай справе важна не перабраць, накшталт «не будзеш слухацца — грошай не ўбачыш». У наш час падлетак можа знайсці іншую крыніцу заробку, і наступствы могуць аказацца нашмат больш горшыя.

«Вы мне ўсё жыццё сапсавалі!»

Такія заявы часта характэрныя для крызісу падлеткавага ўзросту, і важна, каб тое, што робіцца з дзецьмі ў гэты час, бацькам патлумачыў аўтарытэтны псіхолаг. Ломка адбываецца, як лічыцца, згодна з законамі прыроды, бо раней людзі жылі менш, шлюбы бралі раней. Сёння прырода такім чынам рыхтуе падлетка да таго, што ён можа пакінуць сваё роднае гняздо і абыходзіцца без бацькоў, не чапляцца за іх.

— Бацькам варта пагаварыць з падлеткам, сказаць, што яны разумеюць пазіцыю дзіцяці, і прапанаваць новае жыццё размеркаваць па іншых прынцыпах, — тлумачыць Міхаіл Шукайла. — А пасля ўжо зыходзіць з пазіцый, што ты дарослы, і цяпер мы ўсе будзем жыць інакш. Нават калі ў жыцці сям'і няма крыўдных фактаў, малому важна іх прыдумаць і ў іх жа паверыць — адсюль і многія непаразуменні. Але праз нейкі час самому дзіцяці стане не зусім зручна. Любы крызіс — пачатак змен, і важна, як бацькі на гэта адрэагуюць. Пасля «складаны» ўзрост праходзіць, дзіця пакрысе сталее, настае паразуменне.

«Вы мяне нікуды не пускаеце!»

Часта падлеткі ў рамантычных памкненнях не ўлічваюць заканадаўчыя моманты, спісваючы ўсё на нежаданне і забарону бацькоў. Вядома, час прыходу дадому ўвечары абгаворваецца, асабліва калі рана цямнее. Але ж нават закон забараняе непаўналетнім да 16 гадоў знаходзіцца на вуліцы без суправаджэння дарослых з 11 вечара да 6 раніцы, кажа бацька дзвюх дзяўчат.

«Сёння яна не хоча засцілаць ложак, бо «ўсё роўна тут ніхто не ходзіць», а заўтра ёй спатрэбяцца новыя навушнікі, і, хочаш не хочаш, яна вымушана будзе дамаўляцца».

— Іншы варыянт — дачка неяк хацела паехаць за горад сустракаць свіцянак у пяць раніцы. — распавядае Міхаіл. — Аднак выйсці з дому без мяне ці матулі яна можа толькі з шасці раніцы. Так што не мы такія, а закон, і гэта трэба ўлічваць. А неяк у 13-гадовым узросце яна хацела паехаць у суседні горад у госці. Замест таго каб катэгарычна забараняць, я патлумачыў, што ў электрычцы без суправаджэння дарослых яна таксама не можа перамяшчацца да 14 гадоў, — першы ж кантралёр паведаміць пра гэта міліцыі, будуць непрыемнасці.

Хочаш бутэрброд? Зрабі!

Уменне згладжваць вуглы ў стасунках з падлеткам — найвышэйшы «пілатаж» бацькоў. Гэта работа патрабуе пастаяннай увагі, каб не спалохаць дзіця, каб не страціць яго, каб не адштурхнуць. А яшчэ ні ў якім разе нельга страчваць бацькоўскі аўтарытэт і твар. Тады дзіця, нават калі захоча, ужо не зможа паважаць бацькоў, якія «накасячылі».

— Вельмі важна своечасова вяртаць адказнасць дзіцяці, калі яно намагаецца перакласці яе на бацькоў. Гэта таксама своеасаблівая маніпуляцыя, аднак усёахопны клопат не вядзе да дабра. Нельга рабіць за дзіця ўсё, — сведчыць эксперт па рабоце з падлеткамі. — Хоча малы бутэрброд? Вось хлеб, сыр, каўбаса. І востры нож, бо ён лепш рэжа прадукты і ў падлетка менш шансаў парэзацца самому. Тупым парэзацца значна лягчэй, як ні парадаксальна, — кажа Міхаіл.

Тое ж самае адносна дамашніх заданняў. Трэба давесці да дзіцяці, што мы, дарослыя, сваю школу ўжо скончылі, а за дзіця ніхто не будзе выконваць іх абавязкі. З-за «двойкі» бацькі засмуцяцца, так, але ж соромна будзе дзіцяці. Калі малы стане дарослым, ніхто не будзе вырашаць яго праблемы, таму трэба прывыкаць да гэтага з маленства.

— Як матываваць дзіця да вучобы? У Законе «Аб правах дзіцяці» сказана, што дзіця павінна добра вучыцца, так што калі малы парушае гэты закон і свой абавязак, то бацькі могуць абмежаваць яго і ў правах. Такім чынам, можна карыстацца гэткай разумнай маніпуляцыяй, бо свае правы дзеці ў нас ведаюць, а вось пра абавязкі забываюцца, — мяркуе медыятар.

Скіраваць у патрэбнае рэчышча

Пратэст падлеткаў часта праяўляецца вонкава, напрыклад у яркім макіяжы ці вопратцы. Метад катэгарычнай забароны і прэсінгу тут не спрацоўвае. Дзіця пастараецца яшчэ больш падкрэсліць, што яно паўстае супраць адладжанай сістэмы. І трэба патлумачыць яму, што мы ўсе жывём у пэўнай сістэме, але можна і ў ёй заставацца чалавекам са сваімі поглядамі і жаданнямі, не кідаючы выклікаў.

— Любая сістэма не любіць яршыстых, і падлетку трэба данесці, што за свае неардынарныя выпады ён будзе «адграбаць» напоўніцу, пастаянна, — лічыць Міхаіл Шукайла. — А вось калі зрабіць мікракрок насустрач сістэме (напрыклад, прыйсці ў школу з не вельмі яркім макіяжам), то яна прыме яго і нават пакажа свае бонусы. Гэта шлях не прыстасавальніцтва, а нармальнага ўпісвання ў асяроддзе. Калі ты хочаш змяніць асяроддзе ў найлепшы бок, найперш трэба ў яго ўпісацца. Задача бацькоў, як бы дзіўна гэта ні гучала, — сапраўды быць тонкімі маніпулятарамі, каб разгледзець у падлетку энергію і скіраваць яе ў патрэбнае рэчышча. Пры гэтым так, каб дзіця нават не зразумела, што ім маніпулявалі, — вось найвышэйшы «пілатаж», да якога варта імкнуцца.

Ірына СІДАРОК.

Цёплы ліст

МАЁ ВЯСКОВАЕ ДЗЯЦІНСТВА

Ева Гвоздзева, дзяўчынка,
Нарадзілася ў сталіцы.
Аднак вясковага жыцця
Яна ніколькі не баіцца.
Можа курак пакарміць,
Агарод вадой паліць.
Умее бульбачку капаць,
З дзедам дровы раскладаць.
Пасля працы — адпачынак.
У вёсцы ж — цэлы заапарк,
Кураня і кот з сабачкам —
Кожны Еве вельмі рад.
І ад кветак на сцяжынцы
Вельмі хораша дзяўчынцы,
А ў сэрцы пачуццё,
Што святлом на ўсё жыццё.

Гэтыя здымачкі і верш да іх даслала наша чытачка Антаніна Мікалаеўна Ерамеева. «Бабуля маленькай Евы — мая сястра Алёна. Фотаздымкі амаль усе з падворка Евіных прадзеда і прабабулі, што знаходзіцца ў вёсцы Вуглы Рагачоўскага раёна».

Выбегчы ранкам з хаты басанож ды рваць ягады проста з куста. Гладзіць козачак ды гуляць у даганялкі з курачкамі. Дапамагаць маме садзіць агарод і назіраць, як з семечка вырастае смачная морква ці агурок. А потым есці вітаміны проста з градкі. Ляжаць з бабуляй на печы і чытаць цікавую кніжку. Шукаць на ўсыпаным зоркамі небе Вялікую і Малую Мядзведзіц. Збіраць у кошык, сплецены з лазы дзядулем, баравікі ды лісічкі. Ночыць усёй сям'ёй на беразе возера ў палатцы. Раскласці з татам вогнішча і доўга глядзець на агонь... У кожнага свае асацыяцыі з дзяцінствам у вёсцы. Але ўсе іх аб'ядноўваюць непадробныя цеплыня і шчырасць. Калі вы таксама лічыце, што вясковае дзяцінства — гэта ЦУДоўна, то дасылайце здымкі вашых дзетак-кветак (з невялічкім аповедам пра фота) на электронны адрас info@zviazda.by або па пошце: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а, рэдакцыя газеты «Звязда», з пазнакай «для «Сямейнай газеты».

АДШТУРХНУЦЦА АД ДНА

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «СГ».)

Ёсць пяць стадый пражывання гора: адмаўленне, гнеў, торг, дэпрэсія і прыняцце. Многія жанчыны гадамі захрасаюць на стадыі торгу. «Калі ты пачнеш хадзіць, я расслаблюся і дазволю сабе нарэшце адпачыць, выйсці на працу ці схадзіць на масаж». У мяне самай яркай была стадыя гневу. Я не адчувала радасці, мяне перапаўнялі раздражненне, крыўда, расчараванне, віна і нянавісць да сябе, свайго дзіцяці. Я злавалася на ўвесь свет, які, як мне здавалася на той момант, мяне ніколі не зразумее і не прыме. Але ў нейкі момант, дзякуй богу, я адчула, што больш не хачу так жыць. Цяпер разумею: гэта самая класная стадыя, бо ў гневе і злосці вельмі шмат сілы, і ты можаш гэту сілу накіраваць на рэальныя дзеянні, пошук шляхоў.

Маім выратаваннем на той момант стаў дабрачынны курс «Асаблівыя» дзеці». Ён дапамог мне знайсці ўнутраную апору, веру ў сваё дзіця і сябе. Я пачала глядзець на Мішу як на вялікую Душу, якая выбрала такую няпростую дарогу. Мая ж задача — проста быць яго праваднiком у найлепшы з магчымых шляхоў. Там я пазнаёмілася з мысленнем, якое не абмяжоўвае, а пашырае. Цяпер праект зрабілі платным, ён называецца «Такі, як мы», я нават нейкі час яго прадзюсіравала. Калі ён быў бясплатны, больш як палова мам кідалі навучанне на паўшляху, бо трэба было працаваць над сабой, над сваёй псіхікай. Не над дзіцем. Гэта праект не пра тое, каб дадаць дзесяць новых ЛФК. Наадварот, ён пра тое, што мама сама можа шмат чаго трансліраваць дзіцяці. І дзякуючы гэтаму яно развіваецца.

Апошнім часам Машы стала значна цікавей з малодшым брацікам, бо ён ужо шмат што ўмее.

«Цяпер у нас дастаткова дазіраваныя трэніроўкі, мы не рвём жылы, каб усё зрабіць, слухаем сябе, слухаем дзіця і проста рухаемся ў сваім тэмпе».

Дзеці да вызначанага ўзросту цалкам капіруюць нас, нашы звычкі, думкі, жыццёвыя стратэгіі. І ідуць з імі па жыцці. У Мішы з нараджэння шмат фізічных абмежаванняў. Каб вырвацца з гэтых пут, яму трэба шмат працаваць і палюбіць напружанне. Свядома ісці ў яго. І я сваім прыкладам магу прывіць яму любоў да напружання, да выхаду за свае рамкі. Але перш-наперш мне трэба было самой навучыцца шукаць радасць у выпрабаваннях, бо раней я заўсёды любіла вызначанасць і камфорт.

Пра «чароўную таблетку» і эфект Пігмаліёна

Я доўга шукала і працягваю шукаць тое, што дапаможа Мішу аднавіцца да фізічна ўмоўнай нормы. Вывучыла мноства кірункаў. І зразумела, што няма «чароўнай таблеткі», якая паставіць дзіця на ногі. Трэба штодня працаваць над сабой, пераадольваць сябе, тады ёсць шанц. І дзеці ў цябе гэтаму пераадольванню вучацца. Таму я пастаянна развіваюся, шукаю, як мне стаць лепшай для таго, каб быць прыкладам для сына. Бо, калі змагу я, Міша таксама зможа.

«Дазвольце сабе знайсці час для сябе. Для пачатку складзіце спіс таго, што вас напаўняе, акрыляе, натхняе».

Адным з такіх пераадольванняў сябе для мяне летась стаў паход на Бялуху. Дзякуй майму мужу, бацькам, няньцы за такую магчымасць. Без іх я не змагла б гэта зрабіць. Я пайшла ў горы, каб выйсці з зоны камфорту і сустрэцца з сабой сапраўднай. Гэта быў няпросты паход, мы жылі ў палатках, было мінус 45 градусаў. Калі ў горадзе ты можаш адступіць, сказаць: «Усё, я больш не магу», — то ў гарах гэта немагчыма: ты альбо ідзеш, альбо замерзнеш. Калі я праходзіла перавал Дэланэ — трохсотметровую ледзяную сцяну — то думала пра Мішу. Для яго звычайная падлога — як для мяне тая сцяна. Міхаіл на сёння — галоўны мой матыватар. Ён спачатку перавярнуў маё жыццё з ног на галаву. А потым, сам таго не ведаючы, надаў яму ўсе мажлівыя і немажлівыя сэнсы.

Што вы бачыце, гледзячы на сваё дзіця? Яго хваробу, абмежаванні, бесперспектыўную будучыню ці сілу, магутнасць і магчымасці? Я глядзела і так, і па-іншаму. У псіхалогіі ёсць такое паняцце, як эфект Пігмаліёна, ці перадузятасці эксперыментатара. Яго сутнасць заключаецца ў тым, што чаканні чалавека вызначаюць яго дзеянні. Псіхолагі Роберт Разенталь і Ленора Якабсон правялі эксперымент: у пачатку навучальнага года яны выдзелілі вучняў з розных класаў пачатковай школы, якія па выніках тэста аказаліся больш таленавітымі, чым іх аднакласнікі. Насамрэч ніякіх асаблівых здольнасцяў у іх не выявілі, і вучні былі выбраны выпадкова, аднак настаўнікам сказалі адваротнае. Паўторнае тэсціраванне ў канцы года паказала, што вынікі «адораных» вучняў у сярэднім палепшыліся, а паказчык IQ павялічыўся. Эфект Пігмаліёна даказвае, што мы сваёй верай фарміруем рэальнасць.

Пасля гор змяніўся мой погляд на дзіця. Многія з нашай групы баяліся, што не справяцца, а гіды ў нас верылі. Я гэту веру ў іх пераняла. Цяпер гляджу на Мішу іншымі вачыма, стала яшчэ менш дрыжання: хутчэй бы пайшоў, загаварыў. І я заўважыла, што сын улоўлівае мой стан і аднаўляецца значна хутчэй, чым раней. Не так даўно Міша пачаў поўзаць. Я яму крыху дапамагаю, і ён сам паўзе на кухню, каб паесці. Раней мне здавалася, што ён на гэта не здольны.

Зусім нядаўна Настасся з мужам і дзецьмі пераехалі жыць у вёску. Вырашылі дзеля Міхаіла паспрабаваць з'ехаць ад гарадскога шуму.

Пра час, прысвечаны сабе, і мастацтва маленькіх крокаў

Самы галоўны пункт апоры — людзі. У маёй гісторыі такой апорай стаў мой муж. Я была ў цяжкім стане, а ён мяне падтрымаў, прымаў такой, якая я ёсць.

Не бойцеся прасіць дапамогу. Разам з тым важна цаніць людзей і не перакладваць усё на іх плечы. Калі ты трапляеш у «клетку» свайго гора, то гатовы ўсіх вакол, асабліва блізкіх, крыўдзіць, драпаць, біць. «А муж сцерпіць. Бо мне ж так цяжка». Але насамрэч яму не менш цяжка. Проста, калі табе дрэнна, ты не бачыш, як можа быць дрэнна іншым.

— Якую кнігу параіце пачытаць мамам «асаблівых» дзетак?

— «Дзеці з неабмежаванымі магчымасцямі. Метад абуджэння мозгу для паляпшэння жыцця асаблівых дзяцей» Анат Баніель. Там даступна расказваецца аб нейрапластычнасці мозгу, які здольны развівацца ў любым узросце, нягледзячы на дыягназы. І для гэтага не патрэбныя нейкія касмічныя намаганні. Практычныя навыкі з кнігі па сілах укараніць у штодзённае жыццё свайго дзіцяці кожнай маме.

Да з'яўлення Мішы я нават не магла ўявіць, колькі ўва мне сілы, упартасці і мэтанакіраванасці. Але я не робат. У мяне бываюць розныя станы і эмоцыі. Часта наша стомленасць — гэта пачуццё гіперадказнасці, пачуццё доўгу, віны, звычка жыць у напружанні. Я так пражыла амаль два гады з нараджэння Мішы і ведаю не па чутках, як важна ўдзяляць увагу сабе, сваім патрэбам. Мама можа прыняць адэкватнае рашэнне па абілітацыі і аднаўленні свайго дзіця, толькі калі яна ў рэсурсе. А для гэтага трэба навучыцца правільна размяркоўваць свой час, расстаўляць прыярытэты. Дазвольце сабе знайсці час для сябе. Для пачатку складзіце спіс таго, што вас напаўняе, акрыляе, натхняе. Напрыклад, для мяне гэта прырода, прагулкі на свежым паветры, час сам-насам. Таксама выпішыце дзеянні, якія будуць дапамагаць падтрымліваць стан рэсурснасці. Мае варыянты: медытацыя, дыхальныя практыкаванні, кантрасны душ, дэлегаванне паўнамоцтваў мужу, дзецям, бацькам, няньцы, планаванне адпачынку.

Міша развіваецца дастаткова павольна, але да мяне толькі зусім нядаўна прыйшло прыняцце яго тэмпу. Мы раней жыць не паспявалі, ездзілі на ўсякія працэдуры, да розных спецыялістаў, елі ў машыне. Мітусня, страх не паспець, не зрабіць, не справіцца... У нейкі момант мы з мужам зразумелі, што гэта не спрынтарскі забег, а марафон на доўгую дыстанцыю. І калі мы гэты марафон будзем прабягаць як спрынтары, напэўна, хтосьці не вытрымае. Цяпер у нас дастаткова дазіраваныя трэніроўкі, мы не рвём жылы, каб усё зрабіць, слухаем сябе, слухаем дзіця і проста рухаемся ў сваім тэмпе. Самае галоўнае ў гэтай справе — індывідуальны падыход, дысцыпліна і рэгулярнасць. Мы спрабуем розныя метады, штосьці атрымліваецца, штосьці — не. Але гэта ўжо не суправаджаецца расчараваннем ці катэгарычнасцю: вось толькі гэты метад і ўсё, толькі так і больш ніяк. Трэба дзейнічаць са стану дастатку: гэты астэапат ці інструктар не самы апошні, хто дапаможа аднаўленню дзіцяці. Вы знойдзеце свайго.

Што дапамагло і дапамагае Настассі Унучак

Час: у кожнага свой тэрмін для прыняцця сітуацыі.

Веды: для мяне новыя веды роўныя новым магчымасцям. Раю мамам больш чытаць пра хваробу дзіцяці. Страх, як правіла, з'яўляецца ад недахопу ведаў.

Вера ў сваё дзіця: яна робіць цуды.

Свая прастора: магчымасць заняцца сабой і тым, што цікава менавіта мне. А не толькі рэабілітацыяй, новымі методыкамі і пошукам патрэбных спецыялістаў. Плюс псіхатэрапія ў спецыялістаў, якія працуюць у тэме асаблівага бацькоўства, таму што гэта сапраўды асобная тэрапія.

Фінансы: звычайныя бацькі нават не могуць сабе ўявіць, колькі грошай неабходна для якаснай абілітацыі і аднаўлення здароўя малечы.

«Няма «чароўнай таблеткі», якая паставіць дзіця на ногі. Трэба штодня працаваць над сабой, пераадольваць сябе, тады ёсць шанц».

Цяпер майму сыну амаль чатыры гады, і ён пакуль не ўмее хадзіць і гаварыць. І пры гэтым так многаму навучыліся і ён, і ўся наша сям'я, пераадольваючы цяжкасці кожны дзень. І самае каштоўнае ў тым, што мы нанова навучыліся смяяцца і радавацца.



А я пачала весці блог. Бачу сваю місію ў тым, каб праз Мішу дапамагаць сем'ям, якія сутыкнуліся з крызісам нараджэння і выхавання «асаблівых» дзяцей. Я хачу паказваць, што можна інакш. Мяне гэта натхняе, радуе, мне гэта хочацца рабіць. Я з радасцю падзялюся сваім досведам, ведамі, карыснай інфармацыяй і кантактамі, калі вы на пачатку шляху ці захраслі на нейкай стадыі пражывання свайго гора. Я падтрымаю вас усім сэрцам, таму што ведаю, ШТО вы можаце адчуваць.

Надзея ДРЫНДРОЖЫК.
Фота з сямейнага архіва гераіні.

23 ІДЭІ ПАДАРУНКА

Шпаргалка для тых, каму складана «крэатывіць» самастойна напярэдадні 23 лютага

Прыказка «Як гукнеш, так і адгукнецца» выдатна падыходзіць для апісання «ўзаемаадносін» двух свят, што знаходзяцца ў календары побач — 23 лютага і 8 Сакавіка. Дзень абаронцаў Айчыны, калі ў сучаснай традыцыі мужчын ушаноўваюць проста за прыналежнасць да мужчынскага полу, — сапраўды своеасаблівы «люстраны адбітак» Міжнароднага жаночага дня. Ды не, мужчын мы віншуем 23-га не проста з тым, што ў іх ёсць Y-храмасома. У гэты дзень жанчыны дзякуюць моцнаму полу за тое, што любімыя мужчыны робяць наша жыццё больш трывалым і бяспечным, за дапамогу і падтрымку, за ўменне падставіць плячо, знайсці патрэбныя словы і правільнае рашэнне, за сілу і дабрыню, любоў да дзяцей і ўменне іх выхоўваць, за тое, што за імі — «як за каменнай сцяной»...

З чым цябе і віншую

Выказаць усё гэта прыходзіць час якраз 23 лютага. І, вядома, хочацца падарыць дарагім мужчынам што-небудзь такое, што падкрэсліць нашы пачуцці да іх. Але праблема ў тым, што ўся сучасная індустрыя ў значна большай ступені арыентавана на жанчын. Такім чынам, мужчынам «скрэатывіць» падарунак на 8 Сакавіка значна прасцей, чым нам — на 23 лютага. Першае, што прыходзіць у галаву ў гэтай сувязі, — знакамітыя «бялізна-шкарпэткі», «рытуальны» падарунак, выпрабаваны дзесяцігоддзямі. Гэтага дабра, вядома, шмат не бывае. Але дадзены варыянт мы рашуча і з абурэннем адкідаем як няздольны падкрэсліць нашу шчырасць і пяшчоту.

«Што праўда, тое праўда — нават у самым сур'ёзным мужчыну дзесьці ў глыбіні душы жыве маленькі хлопчык».

Але калі не гэта — тады што? Добра, калі ў вашага мужчыны ёсць хобі — ад камп'ютарных гульняў да рыбалкі. Тады і з падарункам пытанняў не будзе (хоць, магчыма, пытанні ўзнікнуць з бюджэтам такога падарунка). Трэба ўсяго толькі выведаць у яго сяброў, чаго такога «вузкаспецыяльнага» вашаму міламу не хапае, каб задавальненне ад занятку было поўным. А калі — як у большасці сучасных людзей — на хобі ў яго проста не застаецца часу, калі ён рухаецца па зачараваным коле «праца — дом», а ў рэдкія вольныя хвіліны проста праглядае стужку навін?.. Што ж, тады ідзём па крамах, узброіўшыся «разумнай сумай» і творчым натхненнем. А ідэй мы вам накідаем. Неабавязкова ўвасабляць іх у жыццё — можа быць, плён нашага мазгавога штурму падштурхне вас да ўласнага нестандартнага рашэння, якое і скажацца адзіна правільным.

А цяпер — ідэі...

1. Бесправадныя навушнікі. Падарунак падыдзе практычна для любога ўзросту (ад 15 да 50, а можа быць, нават і для больш сталых мужчын). Дызайн гаджэта падбіраем зыходзячы са стылю адзення вашага мужчыны, не шкадуем грошай — тут прапарцыянальнасць «цана — якасць» прамая. Дарэчы, і іншыя аксесуары для тэлефона або смартфона — нядрэнны выбар. Вам трэба толькі дакладна ведаць мадэль тэлефона мужчыны.

2. Power Bank (партатыўная зарадная прылада). Яшчэ адзін падарунак, які падкрэслівае, што ваш мужчына малады душой і сучасны — а гэта любому прыемна. Несумненны плюс — ён заўсёды будзе на сувязі і не зможа адгаварыцца, што «ў тэлефоне скончылася зарадка». Сёння прапануюцца самыя розныя варыянты па дызайне і аб'ёме акумулятара. Лепш спыніць выбар на досыць энергаёмістым, але пры гэтым не занадта габарытным варыянце.

3. Відэарэгістратар. Рэч каштоўная для любога аўтааматара, і пры гэтым многія наўрад ці купяць яе самастойна, а вось атрымаць яе як дар не адмовіліся б. Да таго ж гэты падарунак кажа пра тое, што вы клапоціцеся аб бяспецы мужчыны.

4. Камп'ютарная мышка. Якасная бесправадная мышка будзе дарэчы і тым, хто шмат працуе за камп'ютарам, і тым, хто любіць камп'ютарныя гульні. Да 23 лютага ў інтэрнэт-крамах можна знайсці мышкі нават у выглядзе танка — але гэта, вядома, на аматара.

5. Заплечнік для ноўтбука. Стыльны і зручны, такі падарунак будзе ацэнены па заслугах, калі ваш мужчына часта носіць з сабой «ноўт». У спецыялізаваных заплечнікаў ёсць стужка для мацавання гаджэта і шмат зручных кішэняў.

6. Тэрмакубак. Ну ці проста тэрмас — па-старому. Зіма ў нашых шыротах доўжыцца паўгода, і кожны раз, смакуючы духмяную гарачую каву ў дарозе, ён будзе з цеплынёй думаць пра вас. Проста кубак з пацешным або кранальным надпісам (цяпер іх у продажы мора) — таксама варыянт, але тэрмакубак усё ж такі лепш.

7. Абанемент у трэнажорную залу/фітнес-цэнтр. Падыдзе не ўсім, але большасці мужчын сапраўды прыйдзецца дарэчы. Лепш за ўсё выбіраць сетку фітнес-клубаў, якая мае філіялы, — каб ён мог трапіць у любую залу паблізу ў вольны час. А сам абанемент выбіраць безлімітны, тады пытанне з «не паспяваю» вырашыцца само сабой. Толькі пераканайцеся, што спартыўны кірунак, абраны вамі, сапраўды цікавы і блізкі вашаму мужчыну.

8. Ножык. Жанчыны любяць абмяркоўваць, што мужчыны да 30 гадоў так і застаюцца падлеткамі... А камусьці і пяцідзесяці гадоў мала, каб пасталець... Што праўда, тое праўда — нават у самым сур'ёзным мужчыну дзесьці ў глыбіні душы жыве маленькі хлопчык. А хлопчыкі любяць ножыкі. Якасны складаны нож з наборам розных прыстасаванняў дакладна прыйдзецца даспадобы вашаму выбранніку. Да таго ж «зброя» якраз адпавядае стылістыцы свята.

Аднак — калі для вас гэта важна — не забывайцеся на спосабы абысці дрэнныя прыкметы (капейка ў якасці «адказу»).

9. Наведванне квест-рума. Сертыфікат ў квест-рум таксама апелюе да «падлетка» ўнутры вашага мужчыны. Але ж час ад часу кожнаму неабходна расслабіцца. А праведзеная разам займальная гульня здольная зблізіць вас і "склеіць" злёгку астылыя адносіны.

10. Насценны турнік/гантэлі. Гантэлі (уручыце іх у прыгожай упакоўцы, зразумела) стануць для вашага мужчыны стымулам прыйсці ў добрую форму. А турнік, дарэчы, гэта не толькі спортінвентар, але і дэталь інтэр'еру. І калі мужчына даўно пра яго марыў, лепш усё ж купіць яго вам самой: бо ён павінен не толькі падыходзіць мужу або сыну функцыянальна, але і ўпісвацца ў абстаноўку вашага дому.

11. Білет на спартыўнае мерапрыемства або на канцэрт. Калі ваш мужчына — балельшчык, падарыце яму білеты з добрымі месцамі на матч любімай каманды. Калі фанат музычнай групы — уручыце білет на яе канцэрт. Тут усё яшчэ прасцей, чым з рыбакамі або геймерамі.

12. Добрая кніга. Раней лічылася, што кніга — найлепшы падарунак. І, цалкам магчыма, гэта так і ёсць для некаторых мужчын. Важна толькі не пралічыцца з аўтарам і тэматыкай твора. Але каму, як не вам, ведаць літаратурныя густы спадарожніка жыцця? Дарэчы, выдатны варыянт — вялікія і прыгожа ілюстраваныя энцыклапедыі, якіх сёння мноства.

13. Кулінарныя вынаходствы. Шлях да сэрца мужчыны ва ўсе часы ляжыць праз страўнік. Калі вы добрая гаспадыня — можна проста накрыць спецыяльна для яго шыкоўны стол. Як падарунак (ці ў дадатак да падарунка). Яго ўпадабаныя стравы, з любоўю створаныя жаночымі рукамі, раскажуць аб вашых пачуццях лепш за словы. А калі загадзя адправіць дзяцей да бабулі, рамантычная вячэра можа плаўна ператварыцца ў рамантычную ноч. Многія жанчыны лічаць, што «найлепшы твой падарунак — гэта я». І не памыляюцца.

«Сёння ў кандытарскіх можна заказаць любы смак і, што немалаважна, любы дызайн. Напрыклад, з яго партрэтам або вашым прызнаннем яму ў каханні».

14. Торт/ядомы букет. Развіваем тэму «шляху да сэрца праз страўнік»: пацешным падарункам (або дапаўненнем да яго) можа стаць ядомы букет — з ружачкамі з каўбасы і цюльпанамі з бекону. Можна яго заказаць, можна стварыць сваімі рукамі, паглядзеўшы майстар-клас у інтэрнэце. Калі ваш мужчына — ласун (а такіх сярод прадстаўнікоў моцнага полу нямала), выдатным варыянтам стане торт. Сёння ў кандытарскіх можна заказаць любы смак і, што немалаважна, любы дызайн. Напрыклад, з яго партрэтам або вашым прызнаннем яму ў каханні.

15. Набор для шашлыкоў. Няма такога мужчыны (не вегетарыянца), які не любіў бы шашлыкі. Да таго ж гэта спрадвеку «мужчынская ежа». Існуе меркаванне, што «шашлык не любіць жаночых рук». Словам, якасны мангал з шампурамі аблегчыць прыгатаванне любімай стравы, значна пашырыць геаграфію вашых выездаў (вам не прыйдзецца ехаць менавіта туды, дзе ёсць стацыянарныя мангалы, а можна будзе спыніцца ў любым маляўнічым месцы). Ну і паскорыць першы вясновы выезд вашай сям'і на прыроду — напэўна, вашаму мужчыну захочацца апрабаваць ваш падарунак у дзеянні.

«Час ад часу кожнаму неабходна расслабіцца. А праведзеная разам займальная гульня здольная зблізіць вас і "склеіць" злёгку астылыя адносіны».

16. Набор інструментаў. Стандартны падарунак для мужчыны — як набор для манікюру для жанчыны. І такі ж бяспройгрышны. Нават калі ваш мужчына «цвіка дома не забіў», магчыма, усе гэтыя бліскучыя штуковіны заахвоцяць яго да такога кроку. А ўжо калі ваш выбраннік «рукасты», ён ацэніць дар глыбей. Але тут важна не памыліцца: вазьміце з сабой у краму кансультанта мужчынскага полу, якому ў гэтым пытанні вы давяраеце.

17. Туалетная вада. «Смачная» мужчынская парфума зробіць вашага мужчыну прыцягальным. Не раўнуйце — самі ж і будзеце нюхаць і ўлюбляцца ў яго нанава. Вядома, выбар парфумы для іншага чалавека — задача складаная. Але — зноў жа — каму, як не вам, ведаць густы вашага героя.

18. Набор для кавамана. Каву любяць усе — ну, ці амаль усе. Можна падарыць каханаму кава-машыну, а калі бюджэт свята сціплы, падыдуць і больш простыя кава-аксесуары. Калі дадаць яшчэ кававую лыжачку з доўгай ручкай або імянны кубачак, можа атрымацца вельмі стыльны падарунак.

19. Утульны халат. Варыянт не толькі для дамаседаў. Цёплы і мяккі, ён сагрэе пасля ванны, падыдзе для паходу ў лазню і паездкі ў санаторый. Дарэчы, халат можна ўпрыгожыць вышыўкай — кароткім надпісам на ваш выбар.

20. Шалік і/або пальчаткі. Па гэтых дэталях спакон веку можна было адрозніць сапраўднага джэнтльмена (згадзіцеся, побач з лэдзі павінен быць джэнтльмен!). Якасны шалік зробіць вашага мужчыну стыльным, а скураныя пальчаткі дапоўняць карціну.

21. Гальштук. Гэты падарунак будзе ўдалым пры супадзенні дакладных абставін. Калі, па-першае, ваш мужчына часта носіць касцюмы і, па-другое, вы добра ведаеце яго густы і перавагі.

22. Майстар-клас. Напрыклад, па дрыфце, калі ваш мужчына даўно водзіць машыну. Або скачок з парашутам. Можна нават сумесны, калі вы — дзяўчына рызыкоўная. Незабыўныя ўражанні гарантаваныя, а менавіта яны звязваюць і аб'ядноўваюць.

23. Настольная гульня. «Настолкі» цяпер у модзе. Ёсць варыянты і для інтэлекту, і для азарту, для дваіх гульцоў і для цэлай кампаніі, складаныя і проста вясёлыя. Каштоўнасць «настолак» у тым, што яны спрыяюць сумеснаму баўленню часу — вочы ў вочы. Няхай ваш мужчына праявіць свае моцныя бакі, а ваш вольны час стане цікавым і... агульным!

Дзіяна РОНІНА.

«Я БЫЎ ЗГОДНЫ НА ЎСЁ...»

«Ува мне загаварылі нейкія амбіцыі»

Пра тое, што Максім Мірны пачаў займацца тэнісам дзякуючы свайму бацьку Мікалаю Мікалаевічу, ведае, здаецца, кожны. І спартыўных вышынь алімпійскі чэмпіён дасягнуў дзякуючы бацьку, аб чым не раз гаварыў у інтэрв'ю. Пры гэтым «самы тэнісны бацька» ў краіне сцвярджае, што скраў у сына дзяцінства. «Сёння многія бацькі кажуць: «Не буду дзіця прымушаць, не хачу пазбаўляць дзяцінства». Так, шмат хто можа мяне папракнуць, што я скраў у старэйшага сына дзяцінства. Але ніхто не можа мяне папракнуць, што я не хацеў яму добрай будучыні. Усё было дзеля гэтага. Тэніс — бацькоўскі спорт. Каб дасягнуць высокага выніку, бацькі павінны быць гатовымі да таго, што іх дзіця будзе праводзіць на кортах, ніколі не ўбачыць сына і не дапамагу яму стаць добрым тэнісістам», — успамінае Мікалай Мікалаевіч. Але ён не пераставаў шукаць магчымасці паехаць у Амерыку, і праз 10 месяцаў пасля таго, як у самалёт да Нью-Ёрка сеў Максім, у Амерыку вылецеў і яго бацька.

«Аб завяршэнні кар'еры Максім Мірны аб'явіў у 2018 годзе. Але адбыцца гэта магло на 10 гадоў раней — у 2008 годзе спартсмена турбавалі праблемы са здароўем».

Максім Мірны мог бы стаць валейбалістам. Мікалай Мікалаевіч планаваў аддаваць сына менавіта ў гэты від спорту, паколькі сам у 1960-я гуляў у элітным дывізіёне чэмпіянату СССР па валейболе. Але знаёмства з вядомым тэніснym трэнерам Аркадзем Львовічам Эйдэльманам змяніла ўсе планы. «З Аркадзем Львовічам мы пазнаёміліся ў маладзёжным цэнтры «Юнацтва», што на Мінскім моры, — успамінае Мікалай Мірны. — Ён прыцягнуў да сябе на працу майго сябра Валеру Лаўрэнава, з часам да іх далучыўся і я. Мяне так захапіў тэніс, што я ўвесь час праводзіў на кортах, нічога іншага не заўважаючы. І Максіму прышчапіў цікавасць. Валера Лаўрэнаў стаў яго першым трэнерам, і я адразу ўключыўся ў падрыхтоўку сына. Мусіць, ужо тады ўва мне загаварылі нейкія амбіцыі з нагоды яго спартыўнай будучыні. Я палюбіў тэніс, зразумеў правілы гульні, але ў падрыхтоўцы гульцоў не разумеў зусім нічога. Праз некаторы час адчуў, што Максіму патрэбны іншы трэнер. Шостае пачуццё мне падказвала, што Аркадзь Львовіч Эйдэльман можа даць майму сыну больш, чым Валерый. І праз год Максім перайшоў да Аркадзя Львовіча», — успамінае Мікалай Мірны.

У 1991 годзе Аркадзь Львовіч Эйдэльман разам са сваёй вучаніцай Таццянай Ігнацьевай (пераможцай юніёрскага Rolland Garros) збіраўся з'язджаць у Злучаныя Штаты Амерыкі. Трэнер пераканаў спонсара, з якім супрацоўнічаў, узяць з сабой яшчэ і перспектыўнага тэнісіста Максіма Мірнага, які ў свае 13 гадоў ужо быў найлепшым гульцом Савецкага Саюза сярод аднагодкаў. 1 красавіка 1991-га Аркадзь Львовіч, Таццяна Ігнацьева і Максім паляцелі ў Нью-Ёрк.

«Я меў зносіны з сотнямі людзей і практычна кожны казаў, што нізавошта б сваё 13-гадовае дзіця не адпусціў так далёка, ды яшчэ і без капейкі грошай. Але я пераканаў, што рызыка і авантурызм у спорце вышэйшых дасягненняў — залог поспеху. Ды і Максім у свае 13 гадоў цудоўна сябе адчуваў за тысячы кіламетраў ад дома. А мне без сына было нялёгка. Хацелася яму дапамагаць, сачыць за трэніровачным працэсам. Але такой магчымасці ў 1991 годзе ў мяне не было. З часам да мяне сталі даходзіць чуткі, што Максім трэніруецца ў рэжыме, які стопарыць яго развіццё. Жаданне паехаць у Амерыку і дапамагаць свайму сыну стала яшчэ мацнейшым. Маё дзіця апынулася адно ўдалечыні ад дома, і мне разам з ім хацелася зведаць нязведанае. Спонсар, дзякуючы якому Максім змог паехаць у Амерыку, зрабіў запрашэнне, каб я змог прыехаць у ЗША. У пасольстве мне сказалі: «Свет не перакуліцца, калі вы не паедзеце» і ў візе адмовілі. Узніклі думкі, што я больш ніколі не ўбачу сына і не дапамагу яму стаць добрым тэнісістам», — успамінае Мікалай Мікалаевіч. Але ён не пераставаў шукаць магчымасці паехаць у Амерыку, і праз 10 месяцаў пасля таго, як у самалёт да Нью-Ёрка сеў Максім, у Амерыку вылецеў і яго бацька.

Фота БелТА.

«У той момант не было чалавека больш шчаслівага за мяне»

Як прафесійны тэнісіст, Максім Мірны развіваўся ў акадэміі Ніка Балецьеры, з якой выйшлі многія сусветна вядомыя тэнісісты. У Фларыдзе хлопец з Мінска апынуўся дзякуючы свайму бацьку, які адчуў, што толькі акадэмія можа даць патрэбны ўзровень падрыхтоўкі, і, самае галоўнае, пераканаў у гэтым спонсараў. «Калі на праглядзе я пачуў ад Ніка Балецьеры «Belarussian boy — good», у мяне крылы за спіной выраслі. Вучыцца ў акадэміі Ніка Балецьеры для нас было за мяжой мараў. Скажу шчыра, нам вельмі пашанцавала. У той момант, калі мы апынуліся на кортах акадэміі, Нік Балецьеры набіраў групу таленавітых дзяцей. Калі б мы апынуліся ў Фларыдзе на тыдзень пазней, невядома, ці ўзялі б Максіма», — успамінае Мікалай Мікалаевіч. — У той момант Максім Мірны ўжо вучыўся ў прэстыжнай школе на Манхэтэне — дапамагла перамога ў матчы над сынам дырэктара. Прычым вучыўся бясплатна. Здавалася б, як можна адмовіцца ад бясплатнай вучобы ў прэстыжнай школе? Але, як адзначае Мікалай Мікалаевіч, тады ўсе думкі былі толькі аб спорце, а не аб вучобе. Бацька і сын папрасілі прабачэння ў дырэктара школы, забралі дакументы і адправіліся ў Фларыду.

«Цяпер я кажу бацькам юных тэнісістаў: «Вы гатовы пайсці на ахвяры, гатовы з'ехаць у іншы горад, звольніцца з працы?»

У 1997 годзе на Уімблдоне ў міксце з Серэнай Уільямс Максім Мірны заваяваў свой першы Вялікі шлем. Гэта быў і першы Вялікі шлем для амерыканскай тэнісісткі. Дарэчы, дуэт Максіма і Серэны склаўся дзякуючы менавіта Мікалаю Мікалаевічу, гэта ён прапанаваў тэнісістцы выступаць са сваім сынам.

«Перамога на Уімблдоне кардынальна змяніла наша жыццё. Мы выканалі сваю асноўную на той момант мэту — зарабілі грошы. Тэнісісту трэба пастаянна ездзіць на турніры ў розныя краіны, а гэта вельмі затратнае задавальненне. Грошай нам не хапала, супрацоўніцтва са спонсарам да таго часу спынілася. Эканомілі як маглі, шукалі таннейшыя білеты, але з меш зручным маршрутам. У тым жа 1997-м Макс з Серэнай выйгралі US Open. Жыць стала яшчэ прасцей: мы нарэшце сталі вольна перасоўвацца, не зважаючы на кошт квіткоў, купілі дом у Фларыдзе. Вядома, у прыярытэце была гульня ў адзіночцы. Мікст быў спосабам забяспечыць сябе, адчуць фінансавую свабоду, каб надалей развівацца ў адзіночцы», — распавядае Мікалай Мікалаевіч.

У 1994 годзе Максіма запрасілі ў каманду на Кубак Дэвіса. Ён — адзін з доўгажыхароў гэтага турніру, нязменна гуляў за каманду нашай краіны з 1994 да 2018 года. Мікалай Мірны падкрэслівае, што яны адразу вырашылі выступаць за каманду. Іншых варыянтаў не было, паколькі выступаць за краіну ў Кубку Дэвіса — вялікі гонар для тэнісіста. Адначасова з дэбютам у Кубку Дэвіса Максім Мірны зарабіў сваё першае рэйтынгавае ачко. «Я тады працаваў у нашай федэрацыі і атрымаў факс, які паведамляў, што Максім Мірны трапіў у рэйтынг ATP. Мне здаецца, у той момант на свеце не было чалавека больш шчаслівага за мяне», — успамінае Мікалай Мікалаевіч.

«Мы не баяліся ісці на авантуру і рызыку»

Аб завяршэнні кар'еры Максім Мірны аб'явіў у 2018 годзе. Але адбыцца гэта магло на 10 гадоў раней — у 2008 годзе спартсмена турбавалі праблемы са здароўем. «Мы вельмі не хацелі, каб Максім быў тым спартсменам, якому час і гонар сыходзіць, а ён усё роўна працягвае гуляць, хоць і выглядае ўжо не вельмі. Хацелася скончыць кар'еру годна, у патрэбны час. Але ў 2008-м мы адчувалі, што гэты час яшчэ не прыйшоў, хоць здароўе Макса казала пра адваротнае. Некалькі месяцаў ён мучыўся ад болю, і ніхто не мог разабрацца, у чым прычына і як лячыць», — распавядае Мікалай Мікалаевіч. На шчасце тысяч аматараў Максіма Мірнага, бразільскі спецыяліст вырашыў праблему. Але ўзніклі іншыя складанасці — змяніўся сам тэніс: струны ракеткі і мячы сталі цяжэйшыя, мяч стаў ляцець павольней, змянілася пакрыццё кортаў... Як адзначае Мікалай Мірны, гульні гэта дадало відовішчнасці, гульцам — галаўнога болю. Максім, які ўжо склаўся як тэнісіст, прывык гуляць у хуткасны тэніс, з выхадам да сеткі, актыўнай гульнёй. Яму было складана перайсці на новы тэмп. Наступіў фінал гульні ў адзіночцы, чаго нельга было сказаць аб парнай гульні, якая стала кампрамісам. І вынікі не прымусілі сябе чакаць. У 2011 і 2012 гадах Максім Мірны перамог на Rolland-Garros, у 2013-м — на US Open. І, вядома, асобна стаіць сумесная з Вікторыяй Азаранкай перамога на Алімпійскіх гульнях у Лондане.

«Будзе несправядліва сказаць, што ў нас з сынам усё было бясхмарна і лёгка. Вядома, паміж намі ўзнікалі непразуменні, канфлікты. У такія моманты ўключалася мудрасць Максіма, і ён знаходзіў кампраміс. Складаныя моманты бываюць ва ўсіх. Але яны так нас загартавалі, што мы ўсё пераадолелі разам. Не праходзіць і дня, каб мы не былі на сувязі. Мы сталі настолькі моцнай камандай, што працягваем усё рабіць разам, як некалі даўно разам бегалі ў Серабранцы».

«Алімпійскі медаль не перавешвае дзесяць «шлемаў», заваяваных Максімам. Але ён вышэйшы за адзін, любы з іх, але адзін. Мы ішлі да яго даўно, у Лондане была ўжо чацвёртая Алімпіяда. У першыя хвіліны пасля перамогі Максіма і Вікі мяне перахапілі журналісты «Першага канала». А я ад эмоцый і слова сказаць не мог. Памятаю толькі мітусню на стадыёне. Яшчэ б, беларусы перамаглі англічан на Алімпіядзе ў Лондане», — дзеліцца Мікалай Мікалаевіч.

«Я перакананы, што рызыка і авантурызм у спорце вышэйшых дасягненняў — залог поспеху».

Актыўная спартыўная кар'ера Максіма Мірнага пачалася з падачы яго бацькі, паводле яго парады яна і скончылася. Мікалай Мікалаевіч згадвае, што ў 2018 годзе гэтае рашэнне ўжо вісела ў паветры. На неабходнасць яго прыняцця ўказвалі многія фактары. Нагадваў аб сабе і «тэнісны» локаць, які шматлікім гульцам ускладняе жыццё. «Мы не хацелі быць тымі, хто «целяпаецца» ў сотні, і не сталі чакаць, калі гэты момант настане», — адзначае Мікалай Мікалаевіч.

«Маё дзіця апынулася адно ўдалечыні ад дома, і мне разам з ім хацелася зведаць нязведанае».

«Мы з сынам прайшлі выдатны спартыўны шлях, у яго склалася бліскучая тэнісная кар'ера. Мы ўсіх вышынь дабіліся сваёй працай. І мы чыстыя перад сабой і перад Богам. Не ўтойваю, ёсць незадаволенасць, што ў адзіночцы ён быў толькі 18-м, патэнцыялу хапала, каб увайсці ў дзесятку. Можа, мая віна ў тым, што не атрымалася, можа, наша агульная. А можа, 18-е месца і было пікам. Мы з Максімам не баяліся ісці на авантуру і рызыку. І гэта сябе апраўдала. Макса ўвесь свет ведае як выдатнага тэнісіста. Я поўнасцю задаволіў свае амбіцыі. Цяпер я кажу бацькам юных тэнісістаў: «Вы гатовы пайсці на ахвяры, гатовы з'ехаць у іншы горад, звольніцца з працы?» Каб тваё дзіця падымалася высока, трэба быць гатовым на перамены, гатовым на ахвяры. Не можа быць так, што дзіця будуе спартыўную кар'еру, бацька ўвесь час дапамагае яму і пры гэтым усё добра дома. Працуючы з Максімам, я атрымаў незаменны трэнерскі досвед, адбыўся як добры менеджар».

З 2011 года ў Мінску працуе Тэнісны цэнтр Максіма Мірнага, якім кіруе Мікалай Мірны. Тут свае першыя крокі на корце робяць 280 дзяцей.

Валерыя СЦЯЦКО.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «СГ».)

Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

Лот № 1

1) Кап. строение с инв. № 100/С-13534 (наименование: мастерская РСЦ; назначение: здание специализированное иного назначения) площадью 1236,6 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., г. Брест, ул. Суворова, 21Т, мастерская РСЦ, на земельном участке с кад. номером 140100000001032728 площадью 2,1578 га, составные части и принадлежности: три пристройки, два сарая, навес, сеть водопровода, электрическая сеть, молниеотвод (металлический), проезды заводской зоны: асфальтированный проезд, инв. ном. по бух. учету 020046, благоустройство: бетонное покрытие (площадки и дорожки), инв. ном. по бух. учету 020048; спецограждение (бетонные плиты с металлической надстройкой), инв. ном. по бух. учету 020060. 2) Кап. строение с инв. № 100/С-13063 (наименование: пилорама; назначение: здание специализированное иного назначения) площадью 226,3 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., г. Брест, ул. Суворова, 21В/18, на земельном участке с кад. номером 140100000001032728 площадью 2,1578 га. 3) Кап. строение с инв. № 100/С-13792 (наименование: сушилка; назначение: здание специализированное иного назначения) площадью 82,8 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., г. Брест, ул. Суворова, 21В/19, на земельном участке с кад. номером 140100000001032728 площадью 2,1578 га. 4) Кап. строение с инв. № 100/С-13062 (наименование: склад материалов с технопунктом; назначение: здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ) площадью 1098,1 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., г. Брест, ул. Суворова, 21В/24, на земельном участке с кад. номером 140100000001032728 площадью 2,1578 га. 5) Кап. строение с инв. № 100/С-13661 (наименование: склад материалов отдела сбыта; назначение: здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ) площадью 489,5 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., г. Брест, ул. Суворова, 21В/25, на земельном участке с кад. номером 140100000001032728 площадью 2,1578 га. 6) пожарный водоем, площадью 2800,0 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., г. Брест, ул. Суворова, 21В, на земельном участке с кад. номером 140100000001032728 площадью 2,1578 га. 7) уличное освещение – 5 светильников, мощностью 250 Вт, проводов задействовано 85 м АВВГ3х10, расположенное по адресу: Брестская обл., г. Брест, ул. Суворова, 21В. 8) Таль электрическая г/п 1,0 т, инв. № 34085, год выпуска 1983 г. 9) Кран консольно-поворотный г/п 2,0 т, инв. № 34341, год выпуска 1981 г. 10) Кран-балка г/п 3,20 т, инв. № 34469, год выпуска 2003 г. 11) Электробалка г/п 5,0 т, инв. № 34484, год выпуска 1979 г. 12) Комплекс погрузочно-разгрузочный КПР г/п 0,5 т, инв. № 34438, год выпуска 1988 г. 13) Устройство для удаления древесинных стружек, инв. № 40692, год выпуска 1986 г. 14) Склад элеваторного типа, инв. № 34333, год выпуска 1987 г. 15) Склад элеваторного типа, инв. № 34335, год выпуска 1987 г. 16) Склад элеваторного типа, инв. № 34336, год выпуска 1987 г. 17) Склад элеваторного типа, инв. № 34330, год выпуска 1987 г. 18) Котел отопительный «МИР-95», инв. № 39668, год выпуска 2005 г. 19) Котел водогрейный КСВ-0,09Т, инв. № 39787, год выпуска 2012 г. 20) Котел ОВК-45, инв. № 44180, год выпуска 1998 г. 21) Автоматическая пожарная сигнализация, инв. № 39744, год выпуска 2009 г. 22) Автоматическая охранная сигнализация, инв. № 39719, год выпуска 2008 г. 23) Деревообрабатывающий станок, инв. № 31052, год выпуска 1999 г. 24) Автоматизированная охранная сигнализация, инв. № 39720, год выпуска 2008 г. Учетный участок № 1: 25) Яблоня домашняя (дерево), диаметр 15 см. 26) Яблоня домашняя (дерево), диаметр 18 см. 27) Яблоня домашняя (дерево), диаметр 16 см. 28) Слива вишненосная (дерево) диаметр 10 см. 29) Слива вишненосная (дерево) диаметр 10 см. 30) Слива вишненосная (дерево) диаметр 13 см. 31) Слива вишненосная (дерево) диаметр 14 см. 32) Слива вишненосная (дерево) диаметр 12 см. 33) Слива вишненосная (дерево) диаметр 23 см. 34) Груша обыкновенная (дерево) диаметр 100 см. 36) Береза повислая (дерево) диаметр 47 см. 37) Береза повислая (дерево) диаметр 47 см. 38) Береза повислая (дерево) диаметр 45 см. Учетный участок № 2: 39) Вишня обыкновенная (кустарник), 1 шт. 40) Береза повислая (дерево) диаметр 20 см. 41) Береза повислая (дерево) диаметр 28 см. 42) Виноград культурный (лиана), 11 м.п. 43) Вишня обыкновенная (кустарник), 1 шт. 44) Ива ломкая (дерево), диаметр 28 см. 45) Березе повислая (дерево) диаметр 28 см. Учетный участок № 3: 46) Дуб решетчатый, (дерево) диаметр 27см. 47) Сосна обыкновенная (дерево), диаметр 13 см. 48) Сосна обыкновенная (дерево), диаметр 15 см

Начальная цена, руб. (без учета НДС)	651 646,00	**Размер задатка, руб.**	65 164,60

Продавец: ОАО «Брестмаш» г. Брест, ул. Суворова, 21В, тел./факс 8016293 22 96. **Организатор торгов:** Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Брест, ул. Наганова, 10-329, тел./факс 80162408701. Задаток вносится на расчетный счет Организатора аукциона до подачи заявления. **Р/с для перечисления задатка:** р/с BY32BAPB30127866600100000000, в ОАО «Белагропромбанк» ЦБУ № 116 в г. Брест, РД по Брестской области, код банка BAPBBY2X, УНП 201028245, код платежа 40901. **Условия продажи:** без условий. **Срок заключения договора купли-продажи:** не позднее 20 рабочих дней со дня проведения аукциона. **Условия оплаты:** согласно заключенному договору купли-продажи. **Информация о возмещении затрат:** участник аукциона, выигравший торги, оплачивает продавцу НДС в размере 20 % от стоимости продажи объекта, а также в течение 3 рабочих дней со дня аукциона возмещает фактические затраты на организацию и проведение аукциона, включающие вознаграждение Организатора аукциона. **Срок возможного отказа от проведения аукциона:** не позднее чем за 3 календарных дня до наступления даты проведения аукциона

Аукцион состоится 21 марта 2023 г. в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-325

Швейцарская праваабарончая арганізацыя Solidaritatsnetz International выпусціла заяву аб тым, што Малдова перажывае найцяжэйшы крызіс, да якога прывялі неэфектыўнае кіраванне дзяржаўнымі фінансамі і непрадуманая эканамічная палітыка. Прэзідэнт краіны Мая Санду не можа ўзяць сітуацыю пад кантроль, таму імкнецца абмежаваць канстытуцыйныя правы грамадзян і сканцэнтраваць у сваіх руках як мага больш улады. Пад маркай уступлення ў Еўрасаюз яна фарміруе аўтарытарны рэжым, упэўненыя ў Solidaritatsnetz International. Праваабаронцы падкрэсліваюць, што ў Малдове няма стыхійнага бедства ці вайны, таму надзвычайнае становішча неабгрунтаванае. Затое яно дазваляе жорстка душыць масавыя пратэсты, якія ўзначаліў кіраўнік апазіцыйнай партыі Ілан Шор.

Паводле даследавання Міжнароднага рэспубліканскага інстытута, праведзенага летась у снежні, калі б выбары ў парламент Малдовы адбыліся на той час, у заканадаўчы орган прайшлі б прадстаўнікі кіруючай ПАС, руху «Шор», сацыялісты і камуністы. Самы папулярны палітык — мэр Кішынёва Іон Чабан (узровень падтрымкі — звыш 60 працэнтаў), моцны гаспадарнік. У Ігара Дадона — 45 %, Маі Санду — 42 %, Ілана Шора — 41 %. Пры гэтым антырэйтынг прэзідэнта — 55 %, горш толькі ў тагачаснага прэм'ер-міністра Наталлі Гаўрыліцы — 63 %.

Малдаўскі палітычны аналітык Дзмітрый Кісееў заўважыў РІА «Навіны», што Санду не спадзяецца на перавыбранне. Наадварот, яна разумее, што губляе палітычныя ачкі, таму імкнецца перастрахавацца ад датэрміновай адстаўкі. «Яе галоўная мэта — зваліць усё на Расію. Але ў яе гэта не атрымліваецца. Каля 60 працэнтаў малдаван выступае за нейтралітэт у расійска-ўкраінскім канфлікце. Вось Санду і зачышчае інфармацыйную прастору. Нават у кішынёўскім офісе НАТА кажуць, што, на жаль, нашы людзі больш думаюць пра тарыфы, чым пра вайну», — тлумачыць эксперт.

Рэпрэсіі супраць СМІ маюць і эканамічныя прычыны. Канкурэнты паспяшаюцца пераразмеркаваць рэкламны рынак, які ацэньваецца ў сем мільёнаў еўра. Палітолаг Ігар Тулянцаў адзначыў, што ўзмацненне цэнзуры і рыторыка аб хуткім нападзенні Расіі ўзаемазвязаныя. «Санду выбрала шлях служэння Захаду. У выніку Малдова аказалася ў эканамічным крызісе, з якім урад не спраўляецца. Санду не хоча прызнаваць памылкі, таму нагнятае ваенную істэрыю, праводзіць паралелі паміж Кішынёвам і Кіевам, а затым пад гэтую справу просіць грошы ў Бруселя і Вашынгтона», — кажа ён.

Еўрасаюз і ЗША не супраць такой стратэгіі, тым больш што на фоне Украіны Малдова абыходзіцца Захаду танна. Аднак важна, каб сітуацыя не выходзіла з-пад кантролю. Прадстаўнікі краін НАТА падтрымліваюць антырасійскую прапаганду, але адхрышчваюцца ад магчымасці вайсковага сутыкнення. Еўраінтэграцыя ў Малдове ўсё часцей асацыіруецца з хаосам і дыктатурай, адзначаюць апытаныя РІА «Навіны» эксперты. Санду абяцала выбаршчыкам барацьбу з алігархіяй і карупцыяй — «еўрапейскі рамонт». Замест таго — рэкордная інфляцыя, а таксама паралізаваныя суды і парламент, чые функцыі фактычна ўзялі на сябе МУС, СІБ і Камітэт па надзвычайных сітуацыях.

Пётр ДУНЬКО.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ГОДОВОГО ОБЩЕГО СОБРАНИЯ АКЦИОНЕРОВ

Годовое общее собрание акционеров

ОАО «Белэнергозащита»

состоится **29 марта 2023 года** в 11.00
по адресу: **г. Минск, ул. Монтажников, 12.**

Собрание проводится в очной форме.

Регистрация лиц, имеющих право на участие в собрании, будет осуществляться в день проведения собрания по месту (адресу) проведения собрания.

Время начала регистрации: 10.00.

Время окончания регистрации: 10.45.

Дата формирования реестра владельцев акций Общества, на основании которого будет составлен список лиц, имеющих право на участие в собрании: **07 марта 2023 года.**

ПОВЕСТКА ДНЯ СОБРАНИЯ

1. Об итогах финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2022 год (отчеты органов управления и контроля Общества) и основных направлениях деятельности Общества на 2023 год.
2. Об утверждении годового отчета, бухгалтерского баланса, отчета о прибылях и убытках Общества, распределение прибыли и убытков Общества по результатам 2022 года.
3. Об утверждении дивидендов за 2022 год.
4. Об избрании членов наблюдательного совета Общества.
5. Об избрании членов ревизионной комиссии Общества.
6. О вознаграждениях и компенсациях расходов членам наблюдательного совета и ревизионной комиссии Общества.

Ознакомление лиц, имеющих право на участие в собрании, с информацией (документами), подлежащей предоставлению при подготовке к проведению собрания, будет осуществляться в рабочие дни и рабочее время с 09 по 28 марта 2023 года по адресу: г. Минск, пер. Бехтерева, 7А-1, а в день проведения собрания – во время и в месте проведения собрания (29 марта 2023 года, г. Минск, ул. Монтажников, 12).

Для регистрации участнику собрания необходимо предъявить документ, удостоверяющий личность, а также, если необходимо, документы, подтверждающие его полномочия: доверенность и/или другие документы в соответствии с действующим законодательством.

УНП 100098864

ОАО «МНИПИ»

17 марта 2023 года в 14.00

ПРОВОДИТ ОЧЕРЕДНОЕ ОБЩЕЕ СОБРАНИЕ АКЦИОНЕРОВ

ПОВЕСТКА ДНЯ

1. Об итогах финансово-хозяйственной деятельности Общества в 2022 году и основных направлениях деятельности на 2023 год.
2. Отчет наблюдательного совета о проделанной работе.
3. О результатах аудита и проверки ревизионной комиссией финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2022 год.
4. Утверждение годового отчета, годовой бухгалтерской деятельности (финансовой) отчетности, отчета о прибылях и убытках, распределения прибыли и убытков Общества за 2022 год.
5. Об утверждении распределения и использовании чистой прибыли, расходов на потребление, выплате дивидендов за 2022 год.
6. Утверждение направлений использования чистой прибыли и расходов на потребление на 2023 год.
7. Утверждение размеров вознаграждения членам наблюдательного совета и ревизионной комиссии Общества за исполнение ими своих обязанностей.
8. Избрание членов наблюдательного совета и ревизионной комиссии Общества.

Собрание состоится в ОАО «МНИПИ» по адресу: **г. Минск, ул. Я. Коласа, 73.**

Регистрация акционеров – 17.03.2023 г. с 13.00.

При себе иметь документ, удостоверяющий личность.

С материалами по вопросам повестки дня можно ознакомиться по месту нахождения Общества, телефон 270 08 00.

УНП 100039847

Считать недействительными утерянные ЗАО «СК «Белросстрах» бланки страховых полисов: «Добровольное страхование наземных транспортных средств (авто-каско)» формы 2РН, 2РП серии АК, № 0176634, 1 шт.

УНП 100782388

ООО «Деловая оценка» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Табаквинторг» (продавец) извещает о проведении **1 марта 2023 года** повторного открытого аукциона по продаже имущества в 12.00 по адресу: г. Гомель, ул. Жарковского, д. 24, каб. 3-2

ЛОТ № 1: изолированное помещение с инв. № 300/D-678 площадью 960,7 кв. м, назначение – торговое помещение, наименование – торговое помещение, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 340100000001000921, площадь 0,1871 га (доля в праве 37/250); назначение – земельный участок для эксплуатации и обслуживания многоквартирных жилых домов, встроенных изолированных помещений, не относящихся к жилищному фонду.
Адрес: Гомельская обл., г. Гомель, ул. Привокзальная, 2А-109

Начальная цена с НДС: **1 334 160,00** бел. руб.
Задаток (5 %) с НДС: **66 708,00** бел. руб.

Заключены договоры аренды с: РУП «Фармация» – до 24.09.2024 г.; ОАО «Белинвест Банк» – до 01.10.2023 г.; ООО «Городская сеть терминалов» – до 11.11.2023 г.; ИП Мишанина М.Н. – до 31.12.2022 г., ООО «ЕВРОТОРГ» – до 27.04.2027 г.

Продавец: ОАО «Табаквинторг», г. Гомель, ул. Могилевская, 1а. Конт. тел.: 25-26-46; +375 44 599-02-90.

Шаг аукциона – 5 % от предыдущей названной цены продажи предмета аукциона.

Для участия в аукционе необходимо:

1. Оплатить задаток на расчетный счет **Продавца ОАО «Табаквинторг»: р/с BY44PJCB30124055581000000933 ОАО «Приорбанк» (г. Гомель, ул. Красноармейская, 3а), БИК PJCBBY2X, УНП 400078357.**

2. Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов по адресу: г. Гомель, ул. Жарковского, д. 24, каб. 3-2, в рабочие дни с **10.00 до 13.00** и с **14.00 до 17.00** от даты опубликования настоящего извещения.

Прием заявлений заканчивается 28.02.2023 г. в 16.00. Порядок участия и проведения аукциона с перечнем необходимых документов опубликован на сайте www.deloocenka.by.

Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за 3 (три) дня до его проведения. Единственный участник имеет право приобрести лот с шагом **5 %**. Победителем торгов будет признан участник, предложивший более высокую цену. Лицо, являющееся победителем торгов, обязано: подписать протокол о результатах аукциона; заключить договор купли-продажи в течение **10 (десяти)** календарных дней с момента подписания протокола; оплатить предмет торгов **тремя равными долями** каждые **15 (пятнадцать)** календарных дней со дня заключения договора купли-продажи; возместить затраты на организацию и проведение аукциона и оплатить вознаграждение организатору торгов в размере 1,0 % в течение **5 (пяти) рабочих дней** с момента подписания протокола. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет окончательной стоимости предмета оценки. Проводится аукцион в соответствии с Положением Общества с ограниченной ответственностью «Деловая оценка» о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества и права на заключение договоров аренды нежилых помещений (их части).

Конт. тел. организатора аукциона: +375 (232) 34-62-36, +375 (44) 750-40-03, +375 (29) 303-30-62.

ООО «СпецРеализация»

объявляет о проведении вторых повторных открытых торгов в форме аукциона по продаже имущества ликвидируемого юридического лица – ПТУП «АртИдея»

(УНП 191417399, г. Минск, ул. Брилевская, д. 3, оф. 1а).

***Дата и время проведения торгов*: 28 февраля 2023 года.**

Начало – 10.00. Заявки принимаются с 16 февраля 2023 года по 25 февраля 2023 года.

Место проведения торгов: Минск, просп. Победителей, 31-1, конференц-зал ОАО «Гостиница Планета».

Организатор торгов: ООО «СпецРеализация» (УНП 691842036, Минская обл., Минский р-н, Новодворский с/с, д. Большое Стиклево, д. 40, корп. 2, пом. 23, каб. 23-5), тел. 8 (029) 684-71-76.

Продавец: **ПТУП «АртИдея» (УНП 191417399)** в лице ликвидатора – директора ООО «Юридическое агентство «КлеверКонсалт» Колыско А.А.

Шаг торгов – 5 %. Задаток – 2 %.

Подробная информация об имуществе, условиях торгов и порядке проведения размещена на интернет-сайте http://www.specrealization.by.

Контактный телефон для осмотра лота в рабочее время (с 9.00 до 17.00) +375296847176.

Сведения о предыдущих торгах: РИУ «Издательский дом «Звязда», номер газеты 241 (29863) за 08.12.2022. РИУ «Издательский дом «Звязда», номер газеты 20 (29900) за 01.02.2023

ОАО «Гранд Фэшен Хаус»

22 марта 2023 года в 10.00

ПРОВОДИТ ГОДОВОЕ ОБЩЕЕ СОБРАНИЕ АКЦИОНЕРОВ по адресу: г. Брест ул. Куйбышева, 13А/2-9, кабинет 9-3

Повестка дня

1. Итоги финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2022 год и основные направления деятельности Общества в 2023 году.
2. Отчет совета директоров Общества.
3. Отчет ревизионной комиссии Общества.
4. Утверждение годовой бухгалтерской отчетности Общества за 2022 год.
5. О выплате дивидендов и утверждении распределения прибыли Общества за 2022 г.
6. Утверждение основных направлений использования чистой прибыли Общества в 2023 году и 1-м квартале 2024 года.
7. Избрание членов совета директоров Общества.
8. Избрание членов ревизионной комиссии Общества.
9. О размере вознаграждения членам совета директоров и ревизионной комиссии Общества.

Местонахождение ОАО «Гранд Фэшен Хаус»: г. Брест ул. Куйбышева, 13А /2-9, кабинет 9-6.

Место проведения собрания: г. Брест ул. Куйбышева, 13А/2-9, кабинет 9-3.

С материалами, подготовленными к собранию, можно ознакомиться по адресу: г. Брест ул. Куйбышева , 13А/2-9, кабинет 9-3 – с 15 марта 2023 г. по 21 марта 2023 года с 10.00 до 16.00 либо 22 марта 2023 года по месту проведения собрания.

Регистрация участников собрания проводится с 09.30 до 09.50 в день и по месту проведения собрания.

Список акционеров для участия в собрании будет составлен по состоянию реестра на 12 марта 2023 года.

Для регистрации при себе иметь следующие документы: акционеру общества – паспорт, представителю акционера – паспорт и доверенность.

Совет директоров Общества.

УНП 290671335

Ликвидатор ОДО «БИРРУС» (УНП 190068262) в связи с ликвидацией объявляет о проведении 20.03.2023 в 14.00 торгов в форме аукциона по адресу: Минск, ул. Л. Беды, 29, помещение 1Н **по продаже имущества ОДО «БИРРУС»**

Лот № 1. Объект недвижимости: капитальное строение с инвентарным номером 710/С-9216, расположенное по адресу: Могилевская обл., г. Бобруйск, ул. Орловского, д. 25Б, корп. 4 (назначение: склад), площадью 184 кв. м, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 741000000007000570. Начальная стоимость: 13080,00 руб., в том числе НДС 2180,00 руб.

Лот № 2. Объект недвижимости: капитальное строение с инвентарным номером 710/С-9215, расположенное по адресу: Могилевская обл., г. Бобруйск, ул. Орловского, д. 25Б, корп. 4 (назначение: склад), площадью 350,1 кв. м, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 741000000007000570. Начальная стоимость: 24840,00 руб., в том числе НДС 4140,00 руб.

Лот № 3. Объект недвижимости: капитальное строение с инвентарным номером 710/С-9217, расположенное по адресу: Могилевская обл., г. Бобруйск, ул. Орловского, д. 25Б, корп. 4 (назначение: склад), площадью 401,7 кв. м, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 741000000007000570. Начальная стоимость: 27720,00 руб., в том числе НДС 4620,00 руб.

Земельный участок не разделен.

Договор купли-продажи предмета торгов может быть заключен с единственным участником торгов с увеличением стоимости соответствующего лота на 5 %.

Договор купли-продажи предмета торгов заключается в течение 2 дней со дня проведения торгов. Оплата по договору купли-продажи предмета торгов осуществляется в течение 2 дней с момента подписания договора. Предмет торгов по договору купли-продажи предмета торгов передается покупателю в течение 1 дня с момента полной оплаты. Расходы по регистрационным действиям относятся на покупателя.

Имущество находится в г. Бобруйск. Вся информация и порядок осмотра согласовываются по телефонам, указанным ниже.

Заявления на участие в торгах направляются по адресу: 220040, Минск, ул. Л. Беды, 29, пом. 1Н или по электронной почте info@likvidator.by в срок до 16.00 17.03.2023 г.

Справки по тел. 8029 763-97-34 (вайбер, телеграм); 8017 326-22-32.

ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению коммунального дочернего унитарного предприятия «Кинотехпром» (продавец) в лице председателя ликвидационной комиссии Саковича В.П. извещает о проведении 28 февраля 2023 года открытого повторного аукциона со снижением цены на 75 % (лот №1); на 90 % (лот № 5) по продаже имущества в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20

№ лота	Наименование предметов торгов	Начальная цена продажи имущества, с учетом НДС (20 %), бел. руб.	Сумма задатка, с учетом НДС (20 %), бел. руб.
Условие продажи: по лотам №№ 1, 5: затраты по переоформлению документов на переход права собственности возлагаются на Покупателя			
ПОЛНЫЙ и ПОДРОБНЫЙ ПЕРЕЧЕНЬ ИМУЩЕСТВА СО СНИЖЕНИЕМ НА 80 % (ЛОТЫ №№ 1–105 (автозапчасти) размещен на официальном сайте Организатора торгов – www.expert-usluga.by, раздел «Аукционы»			
1	**Капитальное строение с инв. № 350/С-81185** общей площадью **3 264,4** кв. м, назначение – здание административно-хозяйственное, наименование – **здание административно-хозяйственное. Адрес:** Гомельская обл., г. Гомель, ул. Федюнинского, 10. **Капитальное строение с инв. № 350/С-167549** общей площадью **7,7** кв. м, назначение – здание административно-хозяйственное, наименование – **здание административно-хозяйственное (проходная). Адрес:** Гомельская обл., г. Гомель, ул. Федюнинского, 10/2. **Информация о земельном участке:** кадастровый номер **340100000002006414,** общая площадь **0,2036 га (право постоянного пользования). Адрес:** Гомельская обл., г. Гомель, ул. Федюнинского, 10. **ПОДРОБНЫЙ ПЕРЕЧЕНЬ ИМУЩЕСТВА (ЛОТ № 1) размещен на сайте Организатора торгов www.expert-usluga.by, раздел «Аукционы».**	479 791,80	**47 979,18**
5	Сооружение – часть дворового покрытия, инв. № 01361031 (площадью 409,0 кв. м)	6 186,79	**618,68**

Продавец: коммунальное дочернее унитарное предприятие «Кинотехпром», 246007, г. Гомель, ул. Федюнинского, д. 10.

Порядок ознакомления с имуществом осуществляется по контактному тел. **8 (029) 647-81-95, Сакович Вадим Павлович.**

Шаг аукционных торгов – 5 (пять)% от начальной цены предмета аукциона и не изменяется в течение всего аукциона.

Для участия в аукционе необходимо:

1. Оплатить задаток на расчетный счет **Организатора торгов (ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга»):** р/с BY52 BLBB 3012 0400 0712 0400 1001, БИК BLBBBY2X, дирекция ОАО «Белинвестбанк» по Гомельской области, УНП 400071204, назначение платежа – задаток за участие в аукционных торгах по лоту № **(задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления).**

2. Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов можно **с 16 февраля 2023 г.** по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 20, 2-й этаж, каб. «Эксперт-Услуга» в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 16.00.

Прием заявлений для участия в аукционе заканчивается 24 февраля 2023 г. в 16.00 включительно.

Заявления, поступившие после установленного срока, не принимаются. Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за три дня до его проведения. **В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того**, что заявление на участие в нем подано только единственным участником, объект аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на **5 (пять) %**. Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается **Организатором** в течение **5 (пяти) рабочих дней** со дня проведения торгов. Победителями торгов будут признаны участники, предложившие более высокую цену. Лица, являющиеся победителями торгов, обязаны: подписать протокол о результатах аукциона; произвести оплату услуг (вознаграждение) по организации и проведению торгов в течение **5 (пяти) рабочих дней** с момента подписания протокола; заключить договор купли-продажи в течение **10 (десяти) рабочих дней** от даты подписания протокола о результатах аукциона; оплатить приобретаемое имущество согласно договору купли-продажи в течение **15 (пятнадцати) рабочих дней** с момента подписания договора купли-продажи. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет исполнения обязательств по договору купли-продажи. Проводится аукцион в соответствии с Положением «О порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов», утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 № 16 (в ред. постановления Совмина от 12.07.2013 № 607).

Ранее опубликованное извещение о торгах размещено в газете «Звязда» от 10.06.2022 г. № 112 (29734), от 09.06.2022 г. № 111 (29733).

Порядок оформления участия в аукционе, в том числе документации, необходимой для регистрации участника торгов, порядок проведения аукциона размещены на официальном сайте Организатора торгов – www.expert-usluga.by, раздел «Аукционы», на сайте www.gomel-region.by.

Дополнительная информация по контактным телефонам Организатора аукциона: 8 (0232) 23-23-54 (тел./факс), 23-23-56, 8 (029) 651-22-19, 8 (029) 341-15-45, 8 (044) 599-18-16.

ЭКЗАМЕН ДЛЯ ЎСІХ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

«У Міністэрства адукацыі паступілі ўсе прапановы з месяцаў, сфармуляваныя па выніках аналітыкі мерапрыемства. Атрымалі мы і прапановы ад Камітэта дзяржаўнага кантролю, супрацоўнікі якога таксама выязджалі і маніторылі сітуацыю ў пунктах ЦЭ. У мінулую пятніцу прайшла нарада з міністрам адукацыі, на якой прысутнічалі начальнікі ўпраўленняў аддзелаў адукацыі з усёй краіны. Дэталёва былі разабраны ўсе недахопы з мэтай іх ліквідацыі ў даты правядзення асноўнага ЦЭ ў маі», — падкрэсліў Аляксандр Кадлубай.

Фота БелТА.

ДАСТАЎКА — ТОЛЬКІ ЦЭНТРАЛІЗАВАНАЯ

— Гэта быў экзамен для нас усіх, — падкрэсліваe **начальнік галоўнага ўпраўлення агульнай сярэдняй, дашкольнай і спецыяльнай адукацыі Міністэрства адукацыі Марыя КІНДЗІРЭНКА.** — 152 упаўнаважаныя асобы прысутнічалі непасрэдна ў пунктах рэпетыцыйнага ЦЭ, кантралявалі ўсе этапы, каб убачыць праблемныя моманты і ў далейшым акумуляваць іх для прыняцця рашэнняў. Плюс разам з намі ў гэты дзень працавалі прадстаўнікі Камітэта дзяржаўнага кантролю, якія таксама ажыццяўлялі маніторынг непасрэдна ў пунктах правядзення рэпетыцыі ЦЭ. Таму мы поўнасцю валодаем тымі пытаннямі, якія неабходна дапрацаваць і адшліфаваць.

Першы важны момант датычыцца дастаўкі адзінаццацікласнікаў да месца правядзення ЦЭ. На гэты конт былі розныя думкі. Прапаноўвалася дастаўляць навучэнцаў да пунктаў ЦЭ арганізаванымі групамі. Менавіта так мы і зрабілі падчас рэпетыцыі. Таксама была прапанова дазволіць самастойны пад'езд навучэнцаў да месцаў правядзення іспыту ў тым выпадку, калі ЦЭ праходзіць на базе ўстаноў адукацыі ў буйных гарадах. Па выніках нарады было прынята рашэнне, што арганізацыя дастаўкі ўдзельнікаў цэнтралізаванага экзамену да пунктаў яго правядзення будзе ажыццяўляцца ўсё ж такі цэнтралізавана. І адказваць за гэтую пазіцыю будуць непасрэдна ўстановы адукацыі. Гэта значыць, што нашы адзінаццацікласнікі будуць збірацца ў школе. Затым, выкарыстоўваючы або грамадскі транспарт, або школьныя аўтобусы, або заказны аўтобус, яны арганізаванымі групамі па класах у суправаджэнні педагагічных работнікаў будуць дабірацца да пункта правядзення цэнтралізаванага экзамену. Такая пазіцыя была ў Міністэрстве адукацыі першапачаткова і яна ж зафіксаваная ва ўсіх нашых дакументах.

«Падтрымліваючы сняданак у школе (гарачы чай, булачка або печыва) будзе захаваны. Таксама плануецца арганізаваць работу буфетаў непасрэдна ў самых пунктах правядзення ЦЭ. Іх паслугамі змогуць скарыстацца і педагогі, якія знаходзяцца там у чаканні сваіх вучняў, і самі ўдзельнікі экзамену, якія ўжо справіліся са сваёй работай. Такая форма арганізацыі харчавання ў пункце правядзення ЦЭ была вельмі запатрабаваная на рэпетыцыі, таму мы рэкамендуем яе і пры правядзенні непасрэдна цэнтралізаванага экзамену, — падкрэсліла Марыя Кіндзірэнка. — Што датычыцца вяртання навучэнцаў з цэнтралізаванага экзамену, то была падтрымана прапанова, якая прагучала ўжо пасля правядзення рэпетыцыі. Няма неабходнасці пасля заканчэння работы над тэстам пакідаць усіх навучэнцаў у пунктах правядзення ЦЭ, каб потым арганізаванымі групамі дастаўляць іх дадому. Тым больш што на розных прадметах прадугледжаны розны час на здачу экзаменацыйнага тэста. Навошта тым, хто хутка справіўся са сваёй работай, чакаць усіх навучэнцаў са сваёй школы? Асабліва гэта датычыцца гарадоў і тых населеных пунктаў, на тэрыторыі якіх знаходзяцца пункты правядзення ЦЭ.

Але тут ёсць адна важная ўмова, якую давядзецца выконваць. Калі дзіця пажадае дабірацца самастойна, то каб яго адпусціць, педагагічны работнік (а менавіта класны кіраўнік) павінен загадзя атрымаць ад бацькоў пісьмовую заяву, што законныя прадстаўнікі згодныя і дазваляюць свайму дзіцяці самастойна дабірацца дадому пасля правядзення ЦЭ. У такім выпадку мы не бачым праблемы, каб адпусціць дзіця: яно зможа дабірацца дадому самастойна альбо ў суправаджэнні сваіх бацькоў».

НА ЭКЗАМЕН — ТОЛЬКІ З ПАШПАРТАМ!

Як заўважылі прадстаўнікі Міністэрства адукацыі, таксама на парадку дня стаіць і пытанне забеспячэння бяспекі ўсіх удзельнікаў ЦЭ. На ўсіх пунктах цэнтралізаванага экзамену — і ў асноўныя, і ў рэзервовыя даты правядзення экзаменаў — будзе забяспечана дзяжурства медыцынскага работніка або брыгад хуткай медыцынскай дапамогі. Акрамя таго, і ў аўдыторыях, і ў саміх пунктах будзе арганізавана ўзаемадзеянне з падраздзяленнямі Міністэрства па надзвычайных сітуацыях.

Будзе задзейнічана і Дзяржаўтаінспекцыя. Яна будзе кіраваць транспартнымі патокамі каля пунктаў правядзення ЦЭ, бо навучэнцаў будуць падвозіць цэнтралізавана. Каб пазбегнуць стоўпатварэння дзяцей і дарослых на ўваходзе ў пункты правядзення цэнтралізаванага экзамену, будуць распрацаваны графікі прыбыцця ўдзельнікаў.

Дзякуючы рэпытыцыі, арганізатары ўбачылі яшчэ адну праблему. У Інструкцыі па правядзенні цэнтралізаванага экзамену дакладна прапісана, што дакументамі, якія дазваляюць дзіцяці ўвайсці ў пункт правядзення ЦЭ і ў далейшым пачаць выкананне экзаменацыйных заданняў, з'яўляюцца пропуск і пашпарт. «Але частка навучэнцаў пра свой дакумент, які сведчыць асобу, забылася. У асноўныя даты правядзення цэнтралізаванага экзамену гэта норма будзе дзейнічаць бездакорна, — папярэдзіла Марыя Кіндзірэнка. — Ніякіх іншых умоў доступу ў пункт правядзення ЦЭ не існуе, як і на цэнтралізаванае тэсціраванне. Таму для педагагічных работнікаў правядзенне растлумачальнай работы з усімі ўдзельнікамі адукацыйнага працэсу — адзін з асноўных напрамкаў дзейнасці на гэты момант».

Дарэчы, Міністэрства адукацыі плануе праводзіць рэпетыцыі цэнтралізаваных экзаменаў штогод, каб даць магчымасць праходзіць пробны этап цэнтралізаванага экзамену ўсім адзінаццацікласнікам.

НОВЫ ВОПЫТ ДЛЯ АРГАНІЗАТАРАЎ ЦТ

У Рэспубліканскім інстытуце кантролю ведаў у гэтыя дні завяршаецца апрацоўка бланкаў адказаў удзельнікаў рэпетыцыйнага цэнтралізаванага экзамену. Апрацавана каля 85 працэнтаў бланкаў. Пра гэта расказаў журналістам **дырэктар інстытута Юрый МІКСЮК.**

Самая працяглая працэдура — верыфікацыя. Яна робіцца ў інтарэсах навучэнцаў, паколькі праграмнае забеспячэнне не гарантуе стапрацэнтную якасць пераводу рукапіснага тэксту ў электронны фармат. А верыфікатары дапамагаюць машыне разабраць «каракулі» ў бланку, выдаляюць хібы, напрыклад, калі абітурыент выпадкова чыркануў ручкай, каб камп'ютар не залічыў яму няправільны адказ.

— Рэпетыцыйны цэнтралізаваны экзамен паказаў, што мы можам забяспечыць правядзенне справядлівага і аб'ектыўнага выпрабавання, — запэўнівае Юрый Міксюк. — Гэта быў новы вопыт і для нас. Такі падыход, калі адначасова здаюцца ўсе прадметы, прад'яўляе пэўныя і тэхналагічныя, і тэхнічныя патрабаванні, патрабаванні да планавання, а таксама неабходнасць гарантаваць інфармацыйную бяспеку. Да нас паступіла ўся інфармацыя з месцаў: ад назіральнікаў, з пунктаў ЦЭ, ад Камітэта дзяржаўнага кантролю аб праблемных пытаннях. Пераважна складанасці былі звязаныя з тым, што ў мерапрыемстве ўпершыню было задзейнічана вельмі шмат пунктаў і ўдзельнікаў, прыцягнута шмат педработнікаў, якіх неабходна было навучыць, каб яны забяспечвалі строгае захаванне ўсёй працэдуры экзамену.

Сярод адпрацаваных Рэспубліканскім інстытутам кантролю ведаў новых тэхналагічных пытанняў — сістэма рэгістрацыі на ЦЭ. У адрозненне ад ЦТ, на якое абітурыенты рэгіструюцца самастойна, на ЦЭ навучэнцаў рэгіструюць ва ўстановах адукацыі, а потым гэтыя звесткі паступаюць да нас. Мы адзначылі для сябе і такія моманты, як недапушчэнне цеснаты і стоўпатварэння ў пунктах правядзення ЦЭ. Яшчэ раз пераканаліся, што трэба акцэнтаваць увагу ўсіх удзельнікаў ЦЭ на наяўнасці пры сабе пропускаў і пасведчання асобы. Яшчэ ёсць час, каб вырашыць гэтыя пытанні. Калі праблему з пропускам, які навучэнец забыў дома, мы ў стане вырашыць на месцы, то ідэнтыфікацыя асобы і наяўнасць дакумента, які сведчыць асобу, — вельмі важны момант, пра які не трэба ніколі забываць.

Адмысловая ўвага пры правядзенні цэнтралізаванага экзамену будзе аддавацца арганізацыі інфармацыйнай бяспекі. Дастаўку заданняў у асноўны этап ЦЭ будзе ажыццяўляць фельд'егерская служба, так як гэта адбываецца і на ЦТ. Каму будзе перадавацца чамадан з экзаменацыйнымі матэрыяламі, як ён будзе прымацца і дзе захоўвацца (наяўнасць сейфаў), у якіх аўдыторыях будзе праходзіць выпрабаванне — усе гэтыя моманты трэба яшчэ раз прапрацаваць.

БОЛЬШ СУР'ЁЗНАСЦІ!

Прарэктар па вучэбнай рабоце і інтэрнацыяналізацыі адукацыі БДУ Канстанцін КАЗАДАЕЎ таксама падзяліўся ўражаннямі ад ЦЭ, якое прайшло на базе ўніверсітэта.

— Для нас не вельмі прыемным адкрыццём сталі паводзіны некаторых удзельнікаў цэнтралізаванага экзамену, — канстатаваў ён. — Усё ж такі на цэнтралізаванае тэсціраванне абітурыенты рэгіструюцца самі — гэта іх зона адказнасці. Прадметы для паступлення выбіраюць мэтанакіравана, сур'ёзна падыходзяць і да здачы ЦТ, не забываюць пра свае дакументы. Яны знаходзяцца ў асяродку незнаёмых ім людзей і вядуць сабе стрымана, чаго не скажаш пра ўдзельнікаў ЦЭ. Іх рэгіструюць на экзамен педагогі, за іх прадумваецца ўся лагістыка і знаходзяцца яны ў атачэнні сваіх аднакласнікаў. Шчыра кажучы, хацелася б бачыць больш сур'ёзнасці з іх боку, — канстатаваў Канстанцін Казадаеў.

Сярод плюсаў рэпетыцыі ЦЭ прарэктар згадаў магчымасць «тэрытарыяльнай разведкі». У БДУ і БНТУ ў правядзенні цэнтралізаванага экзамену і цэнтралізаванага тэсціравання задзейнічана шмат навучальных карпусоў, і ў будучых абітурыентаў была магчымасць на месцы пазнаёміцца з іх размяшчэннем. Таму падчас праходжання ЦТ ім будзе ўжо прасцей арыентавацца...

Надзея НІКАЛАЕВА.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

Exxpress: **украінская пшаніца замест галодных трапіла ў Іспанію на корм свінням**

Украінскае збожжа, якое павінна было выратаваць ад голаду людзей у найбяднейшых краінах, асела ў Іспаніі ў якасці корму для свіней. Аб гэтым піша аглядальнік аўстрыйскага выдання Exxpress Міхаэль Кох. Аўтар адзначае, што Еўрасаюз змагаўся за стварэнне збожжавага калідора, які дазволіў бы экспартаваць па моры мільёны тон украінскай пшаніцы ў Турцыю. Далей збожжа павінна было экспартавацца ў найбяднейшыя краіны Азіі і Афрыкі для прадухілення «катастрафічнага голаду». З такой мэтай ЕС вёў перагаворы з Расіяй, і Масква дала згоду на бяспечную транспарціроўку збожжа. Адплыццё першых караблёў з пшаніцай святкавалі ва ўсім свеце. Аднак на выхадзе аказалася, што галоўным пакупніком збожжа стала Іспанія. «Хоць іспанцы вырабляюць дастаткова збожжа для ўласных патрэб, Іспанія — адзін з найбуйнейшых вытворцаў свініны ў свеце. І ў гэтую краіну было пастаўлена 2,9 млн тон пшаніцы і кукурузы з Украіны», — піша Кох. У краіны трэцяга свету, адзначае журналіст, пастаўкі ўкраінскага збожжа былі мінімальнымі. Усяго туды накіравалі каля 15 працэнтаў ад поўнага аб'ёму. «Растлумачыць такую сітуацыю проста. Іспанія заплаціла больш грошай, і Украіна накіравала ёй збожжа», — робіць выснову Кох.

Генеральны сакратар ААН заявіў, што цэлыя краіны могуць знікнуць з-за павышэння ўзроўню мора

Антоніу Гутэрыш падкрэсліў, што гэтая праблема датычыцца як малых астраўных дзяржаў, так і прыбярэжных раёнаў многіх краін свету, уключаючы развітыя, паведамляецца на сайце Цэнтра навін ААН. Згодна з нядаўна апублікаванымі новымі данымі Сусветнай метэаралагічнай арганізацыі, у сярэднім глабальны ўзровень мора ў XX стагоддзі павышаўся хутчэй, чым у любое іншае стагоддзе за апошнія тры тысячы гадоў. Пры гэтым Сусветны акіян награваўся хутчэй, чым за апошнія 11 тысяч гадоў. Генеральны сакратар ААН папярэдзіў, што, нават калі павышэнне сярэднясусветнай тэмпературы «дзівосным чынам» удасца абмежаваць да 1,5 градуса Цэльсія, на планеце ўсё роўна адбудзецца значнае павышэнне ўзроўню мора. «Пры любым сцэнарыі такія краіны, як Бангладэш, Кітай, Індыя і Нідэрланды, акажуцца ў небяспецы. Мегаполісы на ўсіх кантынентах сутыкнуцца з сур'ёзнымі наступствамі, уключаючы Лагас, Мапуту, Бангкок, Даку, Джакарту, Мумбаі, Шанхай, Капенгаген, Лондан, Лос-Анджэлес, Нью-Ёрк, Буэнас-Айрэс і Сант'яга», — заявіў Гутэрыш. Паводле яго слоў, найбольшая небяспека пагражае прыкладна 900 мільёнам чалавек, якія пражываюць на нізкіх мясцовасцях у прыбярэжных зонах.

Ашуканцы-сэрцаеды ўкралі ў амерыканцаў $1,3 млрд

Каля 70 тысяч амерыканцаў летась страцілі грошы з-за рамантычных афер у параўнанні з 56 тысячамі пацярпелых годам раней, сведчаць даныя Федэральнай гандлёвай камісіі ЗША (FTC). Ашуканцы летась укралі ў сваіх ахвяр $1,3 млрд, што прыкладна супадае з паказчыкам за 2021 год. Тым не менш аб'ём украдзеных сродкаў значна вышэйшы за суму ў $730 млн, зафіксаваную ў 2020 годзе, і $493 млн па выніках 2019 года. Сярэдняя шкода летась складала $4,4 тыс., найбольш частымі ахвярамі падманы станавіліся людзі, старэйшыя за 70 гадоў. Падобныя віды махлярства звычайна пачынаюцца з сустрэч у дадатку для знаёмстваў або ў сацсетках, адзначае MarketWatch.

Крынічка

Вядучая рубрыкі Ірына ТАМКОВІЧ. Тэл. 8 (017) 287-18-15

Простыя спосабы сяўбы дробнага насення

Дробнае насенне складана раўнамерна размеркаваць у грунце пры сяўбе. У некаторых месцах яно ўзыходзіць рэдка, у іншых, наадварот, занадта часта. Можна звярнуцца да прарэджвання ўсходаў, але не ўсе культуры добра пераносяць такую працэдуру. Радыска пойдзе ў стрэлку, а морква і зусім спыніцца ў росце. Лепш выкарыстоўваць такія метады, якія забяспечаць раўнамернае размеркаванне насення на градцы.

У сяўбе дробнага насення ёсць некаторыя нюансы, і яны вельмі важныя.

Першае — глыбіня сяўбы.

Не сейце яго глыбока! Больш за тое, у выпадку з дробным насеннем любая глыбіня будзе «глыбока». Таму выкладзіце насенне на паверхню і злёгку прысыпце тонкім пластом глебы, або акуратна ўцісніце насенне ў паверхню. Гэта дазволіць парастку пачаць фотасінтэз адразу ж пасля выхаду з семечка, што будзе выдатным стартам.

Другое — склад глебы.

Вельмі важна падабраць правільны субстрат для сяўбы дробнанасенных раслін. Грунтасумесь можна прыгатаваць сваімі рукамі, а таксама набыць у садовых цэнтрах і крамах. Найлепшы варыянт для дробнанасенных раслін — субстраты на аснове торфу. Яны лёгкія, досыць рыхлыя, не ўсыхаюць пры недахопе паліву і не ўтвараюць на паверхні цвёрдую скарынку, якую мініяцюрным парасткам прабіць вельмі складана. Выбіраючы грунт для такіх культур, варта пазбягаць грунтасумесяў з перлітам. Ён можа значна запаволіць з'яўленне ўсходаў.

Разгледзім самыя папулярныя спосабы сяўбы дробнага насення:

ПРЫ ДАПАМОЗЕ ЗУБАЧЫСТКІ

Каб правільна размясціць дробныя семечкі на субстраце і вытрымаць паміж ім дыстанцыю, можна сеяць з дапамогай зубачысткі. Такі спосаб сяўбы дробнага пасяўнога матэрыялу актуальны як для дражыраванага насення, так і для звычайнага. Для сяўбы варта намачыць зубачыстку ў вадзе, а насенне вылажыць на далонь. Па адным семечку варта прымацоўваць на вільготную зубачыстку, прыўзнімаючы яго кончыкам прылады. Далей насенне адпраўляецца на пасадку. З дапамогай зубачысткі можна злёгку заглыбіць насенне ў глебу на некалькі міліметраў.

«ВАДКАЯ» СЯЎБА

Растварыце 30 г крухмалу ў 100 мл халоднай вады. Тонкім струменьчыкам, пастаянна памешваючы, уліце разведзены крухмал у 900 мл кіпеню.

Ёмістасць з клейстарам пастаўце ў каструлю з кіпенем і прагрэйце масу да 95 °С. Гатовы клейстар астудзіце і прапусціце праз сіта, каб прыбраць плеўкі і камячкі, якія ўтварыліся.

У астуджаны клейстар асцярожна ўсыпце дробнае насенне з разліку 1,5-2 г насення на шклянку вадкасці. Пераліце клейстар з насеннем у імбрычак і праверце «густату» будучай сяўбы на паперы. Калі насенне лягло занадта шчыльна, дадайце яшчэ трохі клейстару. Калі ж адлегласць паміж семечкамі даволі вялікая, падсыпце іх яшчэ. Каб не панізілася ўсходжасць, пасеяць насенне ў клейстары неабходна на працягу дня прыгатавання.

СТУЖАЧНЫ СПОСАБ

Насыпце ў шклянку 3 ст. л. мукі і заліце рэчыва 100 г халоднай вады, старанна перамяшайце. Затым заліце мучную масу шклянкай кіпеню і вымешайце. З туалетнай паперы ці сурвэтак нарэжце стужкі шырынёй 1-1,5 см. Шпрыцам нанясіце на падрыхтаваныя папяровыя палоскі маленькія кропелькі сумесі на абранай для сяўбы той ці іншай культуры адлегласці, прыклейце насенне. Зручней за ўсё падхопліваць дробныя семечкі з дапамогай драўлянай палачкі з намочаным кончыкам. Пакіньце стужкі да поўнага высыхання, а пасля скруціце іх у рулончыкі.

ДРАЖЫРАВАННЕ

Адбярыце якаснае насенне і апрацуйце яго малочнай сыроваткай. Торф, перагной і дзярновую зямлю добра прасушыце, прасейце і насыпце ў шкляны слоік.

Асцярожна ўсыпце ў сухую сумесь яшчэ вільготнае пасля апрацоўкі насенне і лёгенька патрасіце ёмістасць. Затым прасейце змесціва слоіка скрозь сіта або марлю.

«Вылаўленае» дражыраванае насенне вылажыце на сухую паперу і дайце яму падсохнуць.

У такой абалонцы насенне зручней высяваць, бо яно большае па памерах. Да таго ж для пачатку росту, пакуль яшчэ не ўмацавалася каранёвая сістэма, расліне будзе дастаткова неабходных пажыўных рэчываў.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	8.28	18.20	9.52
Віцебск —	8.21	18.06	9.45
Магілёў —	8.18	18.10	9.52
Гомель —	8.11	18.10	9.59
Гродна —	8.42	18.36	9.54
Брэст —	8.39	18.40	10.01

Месяц

Апошняя квадра
13 лютага.
Месяц у сузор'і
Казярога.

Імяніны

Пр. *Ганны, Івана, Мікалая, Рамана, Сямёна, Уладзіміра, Уласа, Цімафея.*
К. *Дануты, Данізля, Юльяна.*

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

ЗАЎТРА



Даты Падзеі Людзі

16 ЛЮТАГА

У краіне

1270 год — у бітве пры Карусе войскі Вялікага Княства Літоўскага атрымалі перамогу над рыцарамі Лівонскага ордэна, войскамі Дэрпцкага і Эзель-Вікскага епіскапаў, а таксама намеснікам дацкага караля ў Рэвелі. Бітва адбылася на лёдзе замёрзлага Балтыйскага мора. Ліцвіны страцілі забітымі каля 1600 чалавек, аднак захавалі захопленую здабычу. Лівонская хроніка канца XIII стагоддзя паведамляе аб 52 загінулых рыцарах. Сярод іх аказаўся і магістр Лівонскага ордэна Ота фон Лаўтэнберг. Гэтая бітва стала трэцяй па значнасці перамогай над лівонскімі рыцарамі пасля бітвы пры Саўле (1236) і бітвы пры Дурбе (1260).

1758 год — нарадзіўся (в. Скокі, цяпер у Брэсцкім раёне) Юльян Нямцэвіч, пісьменнік, гісторык, палітычны дзеяч. У час паўстання 1794 года ад'ютант і сакратар Т. Касцюшкі. Быў паранены, зняволены ў Петрапаўлаўскую крэпасць у Санкт-Пецярбургу. У 1796 годзе разам з Касцюшкам выехаў у ЗША. У 1807-м вярнуўся на радзіму, зрабіў некалькі вандровак па Беларусі з мэтай апісання «нацыянальных помнікаў». Адзін з найбольш выдатных пісьменнікаў беларускага Асветніцтва, аўтар драматычных і паэтычных твораў, раманаў, аповесцяў, дарожных нататак. Апісанні Брэста, Гродна, Слоніма, Навагрудка, жыцця беларускіх сялян змяшчаюцца ў яго гістарычных эсэ.

1895 год — нарадзіўся Павел Якаўлевіч Панкевіч, вучоны, доктар педагагічных навук, прафесар, акадэмік АН БССР. У 1922 годзе скончыў Віцебскі інстытут народнай гаспадаркі, Маскоўскія вышэйшыя педагагічныя курсы. У 1925—1937 гадах — выкладчык Камуністычнага ўніверсітэта Беларусі, дырэктар НДІ педагогікі. У 1931—1935 гадах — неадменны сакратар Беларускай акадэміі навук, загадчык педагагічнага кабінета акадэміі. Апублікаваў больш за 20 навуковых прац. Распрацоўваў праблемы політэхнічнай адукацыі, пытанні гісторыі педагогікі і псіхалогіі.

1902 год — нарадзіўся (в. Бязверхавічы, цяпер у Слуцкім раёне) Рыгор Данілавіч Мурашка, беларускі пісьменнік. Аўтар зборнікаў апавяданняў «Прыгранічны манастыр», «Званкі», «Рузікі», рамана «Сын» і іншага. У гады Вялікай Айчыннай вайны ўдзельнік Мінскага падполля, з 1943 года — у партызанах. Загінуў у 1944 годзе падчас прарыву нямецка-фашысцкай блакады партызанамі ў Лагойскім раёне.

У свеце

1568 год — іспанская інквізіцыя вынесла смяротны прысуд усім жыхарам Нідэрландаў. Увядзенне інквізіцыі ў Іспанскіх Нідэрландах стала адной з прычын Нідэрландскай рэвалюцыі 1566—1609 гадоў, у выніку чаго Нідэрланды распаліся на дзяржаву пратэстантаў і дзяржаву каталікоў. 16 лютага 1568 года святая інквізіцыя асудзіла на смерць усіх жыхароў Нідэрландаў як ерэтыкоў, а іспанскі кароль Філіп II загадаў прывесці прысуд у выкананне. Гэта не зусім удалося, але каралеўская армія зрабіла, што змагла. Толькі ў Харлеме было забіта 20 тысяч чалавек, а ўсяго ў Нідэрландах — 100 тысяч.

1893 год — нарадзіўся Міхаіл Мікалаевіч Тухачэўскі, вядомы савецкі ваенны дзеяч, Маршал Савецкага Саюза. У Грамадзянскую вайну камандаваў шэрагам армій. У 1921-м удзельнічаў ва ўдушэнні Кранштацкага паўстання. У 1925—1928 гадах — начальнік штаба РСЧА, у 1928—1931 гадах — камандуючы войскамі Ленінградскай ваеннай акругі, пасля намеснік, першы намеснік наркама абароны СССР. З мая 1937 года быў прызначаны камандуючым войскамі Прыволжскай ваеннай акругі, але праз некалькі дзён арыштаваны і асуджаны да расстрэлу па «справе антысавецкай трацкісцкай ваеннай арганізацыі», рэабілітаваны ў 1957 годзе.

Так гаварыў...

ПІМЕН ПАНЧАНКА:

«Хвала і слава могуць разлучыць, а гора і бяда заўсёды зблізяць».

УСМІХНЕМСЯ

— Значыць, вы кажаце, што я магу выйграць тысячу рублёў?

— Вядома.

— А калі адбудзецца тыраж?

— У суботу.

— Не падыходзіць: грошы патрэбныя да чацвярга.

— Скажыце, чаму вы сышлі з папярэдняга месца работы?

— Па прычыне стомленасці.

— Якой стомленасці?

— Не ведаю, проста яны сказалі, што вельмі ад мяне стаміліся.

Вось кажуць, што дзяўчыне, каб прыцягнуць увагу на вуліцы, дастаткова надзець чырвоную сукенку. Можна падумаць, хлопца ў чырвонай сукенцы ніхто не заўважыць!

— А давай закажам штонебудзь для гасцей?

— Таксі.

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Рэгістрацыйнае пасведчанне нумар 2 ад 17 лютага 2009 года, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 311 17 13 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 311 17 44, маркетынгу — 263 66 73, бухгалтэрыі — 311 17 16.

прыём рэкламы тэл./факс: 311 17 27,

e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by

(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, праспект Незалежнасці, 79/1. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 10.681. Індэкс 63850. Зак. № 419.

Нумар падпісаны ў 19.30

15 лютага 2023 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12